КАЛОСЬСЕ

ЛІТАРАТУРНА-НАВУКОВЫ ЧАСАПІС

КНІЖКА 4



ВІЛЬНЯ 1936 ГОД

Адрас Рэдакцыі: Вільня, Завальная вул. № 1—2.

Складка на год—2 зал., на паўгода—1 зал.

Адна кніжка — 50 гр.

Часапіс выходзіць раз у тры месяцы.

Зьмест кніжкі 4(8) „Калосься“.

Белар. Друкарня ім. Фр. Скарыны, Вільня, Завальная вул. 1—1.

КАЛОСЬСЕ

БЕЛАРУСКІ ЛІТАРАТУРНА-НАВУКОВЫ ЧАСАПІС

Кніжка 4(8) **1936 г.** **Год II**

МАКСІМ ТАНК

ПРАЙДУЦЬ ГАДЫ

Прайдуць гады разорамі, шляхамі,
сатруць няволі чорныя сьляды
і можа казку-быль над курганамі
раскажуць ветры соснам маладым.

Таксама ў вырай пранясуцца гусі
крыклівым шнурам між васеньніх ніў...
А шлях маей лапцюжнай Беларусі
другі ўскалыша песьні пераліў.

Задрэміць вечар казкай старой маткі
ў расе сьцюдзёнай на лістох бяроз;
на небе сінім, безканечным, гладкім
разсее ночка жменю зорных сьлёз.

Ды зноў з дарог і я другім вярнуся,
хоць не сагнуць панурыя гады.
І песьні ўсе аддам я Беларусі
і прыдарожным соснам маладым.

Вільня, 2-IX-36 г.

МАМЧЫНА ҐОРКА

Частка II.

I.

Слуга пайшоў...
Заціх вясёлы гул бяседы,
Ня звоняць чаркі за сталом;
І ад суседа, да суседа
Дружына шэпчыцца кругом.

Сівыя бровы, быццам скрылы,
Нахмурыў срога граф стары.
Вяльможны Жаба стаў маўклівы —
Вясёласьць зьнікла без пары.

Дарэмна граф пазваў музыкаў,
Дарма стараюцца яны,
Як птушка, раптам радасьць зьнікла, —
Сядзяць насупіўшысь паны.

Таемна кожнага цікавіць
Адно пытаньне толькі іх:
Чаму графянка уцякае,
Калі прыбыў такі жаніх?

Як быццам ціша перад бурай
Ў бяседзе панскай залягла
І, каб парваць настрой пануры,
Ўстае Лапата з-за стала.

Бо сваявольны дух магната
Зьнясьці ня можа ўжо далей
Нямую гутарку паглядаў
І кпіны ціхія гасьцей.

Агнём нядобрым і сьцюдзёным
Бліснуў пагляд яго вачэй
І гневам ўсьпененыя словы
Прасілісь вырвацца з грудзей.

Але вось дзьверы адчыніліс, —
Сама Дарута у дзьвярах,
Як дух красы, — яна зьявілась
З вязанкай красак у руках.

Адна вясёлая усьмешка
Парвала жудасны настрой,
Дружына ветла і пасьпешна
Яе вітае грамадой.

Адзін Лапата толькі хмурны, —
Ня быць вясёлым яму, — не;
Ён столькі кпін сьцярпеў ахвярна
І першы раз зьмірыў свой гнеў.

І нават вочы — вочы зоры —
Дачкі стаячай перад ім
Яго ня ўзрушылі пакорай,
Ні сумам сьветлым і ціхім

Пытае ён дачку сьцюдзёна:
Дзе позна так была яна?
Куды яна, амаль штодзенна,
Бяжыць увечары адна?

II.

Ой, нашто калінячка
Рана распусьцілася.
Ой, нашто дзяўчыначка
Ты такой радзілася.

Не прастой сялянкаю,
Ня мужычкай чорнаю,
У мурох — графянкаю
З безбярэжнай воляю.

Ой, нашто любіла ты
Горачку высокую?
Ой, яна згубіла,
Цябе сінявокую.

Каб ня тая горачка,
Што глядзіцца ў возера,
Каб ня тыя зорачкі,
Што сьвяцілі позьненька —

Ня было-б мо' горачка,
Гэтага — дзявочага,
Ой нашто вы, зорачкі,
Іншае прарочылі!

Каб ня тыя вочанькі,
Вочы Янкі — чорныя,
Што сьвяцілі ночанькай
Ярчэй неба зорнага,

Не тапталі-б ножачкі,
Гэнь да гэнай горачкі,
Сьцежачак — дарожачак,
На бяду, на горачка.

Каб не прызнавалася
Ды татульку роднаму,
Што там спатыкалася
З хлопцам чорнабровым.

Ой пад гэнай горкаю,
На бяду, на горкую,
Спатыкаліся,
Пакахаліся,
Заручаліся.
Ой пад горкай гэнаю,
Ды пад шумы сьпеўныя,
Што сьпявалі воляй ім
Сосны баравыя,
Заручалі іх —
Зоры залатыя.

Ой, нашто аб тым
Ты тут гутарыла,
Пачуцьцём сваім
Гасьцей насьмяшыла;

Разгнявіла татку,
Моцна угнявіла,
На сябе і Янку
Бяду заварыла...

Але, прызналася графянка,
Старому графу пры гасьцёх,
Што ўжо даўно кахае Янку,
Што заручыла іх жыцьцё!

Прызнаньне шчырае Даруты
Гасьцей абразіла усіх;
Магнацкай пыхаю надуты
Ўстае абураны жаніх.

За ім ўстае уся дружына, —
Занадта ўзражаны паны! —
І гнеўны хмель... і сьмех... і кпіны;
Ідуць да выхаду яны.

Яшчэ мінута — і зьнікае
Жаніх з дружынай у бары;
Паціху рэха замірае
Далёка ў цёмным гушчары.

III.

Як здань, панура - адзінокі
Сядзіць Лапата за сталом,
І боль цяжкі, і гнеў глыбокі
Гарыць ў вачох яго агнём.

Хто стаў яму перак дарогі?
Хто змог пляны пакрыжаваць?
Ягоны раб — слуга убогі —
Пасьмеў дачку яго кахаць?!

І так запляміў чэсьць магната, —
Крывёй раба ня змыць яе;
Абразу гэту род Лапаты
Нічым, ніколі не сатрэ!

Бо род свой пышны і магутны
Асуджан ён закончыць сам.
Адну надзею меў — Дарута, —
Яе украсьці хоча хам.

І ён яго ў сваім палацы,
З дачкой, як сына, гадаваў,
Але цяпер за ўсё заплаціць,
І час расплаты ўжо настаў.

Няхай нікому не здаецца,
Што ён, стары, ужо зьнямог, —
Яшчэ ён граф — ўладар Залесься,
Яшчэ ён тут і пан, і Бог.

Гневам вочы яго
Загарэліся.
— Эх вы, слугі мае, —
Дзе падзеліся! —
Прывядзіце сюды
Сына мамчына,
Я яму перадам
Маю спадчыну.
Абдару я яго
Маей ласкаю,
Навучу, як кахаць
Дачку панскую. —

Зьнікаюць слугі паслухмяна
Загад выконываць хутчэй,
Бо ім законам воля пана,
А сам за чорта ён страшней.

IV.

Ой знайшлі Івана слугі,
У задум'і пад гарой,
І трымаючы за рукі
Павялі яго з сабой.

Ой вядуць, вядуць Івана,
Слугі ў графскія муры.
Там абдарыць нечакана
Яго ласкай граф стары.

Ён шчасьлівы і каханы, —
Чамуж ножанькі ня йдуць?
Хоць яго з такой пашанай
Слугі графскія вядуць.

Быццам рыбіна у сетцы,
Б'ецца сэрца у грудзёх,
І ня страх у ім ціецца, —
Прачуваньня успалох.

А наўкола так маўкліва
Сьпяць і дрэўцы і кусты,
Толькі бор адзін ляніва
Чуць калышыць шум густы.

І віраццa роем думы,
Думы-птушкі ў галаве,
— Янка, Янка, што-ж ты сумны?
— Ці-ж ня верыш больш сабе?

— Ці мо' сіл ужо ня стала?
— Жах-зьнямогу проч адкінь!
— Будзь і сьмелым і трывалым,
— Ты-ж заўсёды быў адзін.

У пакой размаляваны,
Па пушыстым, па каўры,
Слугі, роем паслухмяным,
Графу Янку прывялі.

І стаіць Янук між імі,
Як загнаны ў пастку зьвер.

Што-ж, Лапата, ты маўклівы,
Ну чыні свой суд цяпер?!

Ну чыні, чыні расправу,
Яшчэ болей катаў кліч!
Загадай пытаць ахвяру, —
Што-ж ты, думны граф, маўчыш?

Чаму воч падняць ня можаш,
Гэтых страшных воч, — чаму?
Ой, над чым яшчэ варожыш?
Страхам глянь яму ў душу!

Паглядзі, якім ён сьмелым
Між рабоў тваіх стаіць,
І якая моц бяз меры
У вачох яго гарыць?

Не спужаецца удалы
Ні вяроўкі, ні кручка,
Ой, нядарма пакахала
Яго графская дачка!

І глянуў срога граф на Янку,
Як толькі ён глядзець умеў,
І самі каркі ніжэй гнуцца,
І страху дрож прайшла ў таўпе.

Адзін Янук спаткаў спакойна
Пагляд нялюдзкіх воч яго,
Ў цямру сьцюдзёнага бяздоньня
Зірнуў адважна, — аж на дно.

Стаялі доўга без апрыву
У вочы гледзячы сабе;
І першы раз мо' граф ня выйграў
У гэтай страшнай барацьбе.

Ён першы раз убачыў сілу
На дне бунтуючай душы,
І першы раз, мо' дрож жахліва
Кранула сэрца у цішы.

Але ён — пан, сымболь улады,
Страсе спалох, як сон які;
За ім закон, рабы і каты,
Пакоры сонныя вякі.

І гневам зноў усхваляваны
(Яго палохаць сьмее хам?)
І больш ня гледзячы на Йвана, —
Кідае грозна ён слугам:

Ой вы слугі мае
Паслухмяныя,
Ці ўжо болей мо' вам
Стаў ня панам я?!

Паміж вамі вось той,
Вораг люты мой,
Што запляміў мой род, —
Пакахаўся з дачкой.

Пакуль толкам усё
Я абдумаю,
Як закончыць жыцьцё
Яго шумнае,

Адвядзіце яго
Ў лёху цёмную —
Там гатовы ужо
Кут бяздомнаму.

Выбірайце хады
Найдалейшыя,
Замыкайце замкі
Наймацнейшыя.

І пільнуйце, як воч,
Яго — ўпартага,
Хай стаіць дзень і ноч
Там хтось вартаю.

Пакуль толкам усё
Я абдумаю,
Як закончыць жыцьцё
Неразумнаму.

V.

Ў зямлі, глыбока пад палацам,
Было ў Лапаты многа лёх —
Прытулак тым, хто панскай працы
І крыўды больш зьнясьці ня мог.

Навокал воля пана-ката;
Гуляў прыслужнік і цівун,

Прымус і зьдзек вісеў над хатай,
А ў хаце — голад і калтун.

Была пара — цямней за ночку
Душа працоўнага была,
Усе пуці і ўсе дарожкі
Вялі да панскага ярма.

І толькі дзьве былі дарогі,
Хто бунт душы згасіць ня мог:
Адна — у бор — шукаць падмогі,
Другая — гніць у цёмны лёх.

І людзі гінулі бяз рады,
Як лісьце кінутае гніць,
Каб сокам іх маглі магнаты,
Усякай масьці, пышна жыць.

Хоць крыху іншыя прычыны
У лёхі Янку прывялі,
Ды толькі тут паняў хлапчына,
Што ён з мужыцкае сям'і;

Што лёс з праўдзівай каляіны
На жарты выкінуў яго;
Ён — раб! і быць хацеў шчасьлівым, —
Мог сьніць пра сьветлае жыцьцё!

І дні яго, яго абмылкі,
Дакорам сталі перад ім. —
Мо' ён радзіўся быць асілкам,
А лёс зрабіў яго сьляпым?

І думы, думы зашапталі
Пад жаль пякучы у грудзёх,
І бунтам сэрца хвалявалі
Ў цішы магільнай цёмных лёх.

Дзе падзелась наша доля,
Эх, Іван — Іване!?
Наша доля ў чыстым полі,
Блудзіць у тумане.

У няволі лёс працоўны,
У рукох у пана;
Мы усе ярмо прыгону
Цягнім паслухмяна.

Нашу волю ў цёмных лёхах
Расьпінаюць каты,
Дзе шукаць нам перамогу —
Мы — народ пракляты.

Толькі ў боры, ў цёмных нетрах —
Нам правы пісаны,
Ды нам болей з буйным ветрам
Ня гуляць Іване!

З гэтых лёх ніхто ніколі
Жыў яшчэ ня выйшаў,
Толькі вецер ў чыстым полі
Успамін калышыць.

Згінеж марна ты, Іване,
Як лісток сарваны,
Хоць так пышна сьнілась раньне
Радасьці вясьнянай.

За віну якую, Янка,
Трэ жыцьцё аддаці?
Эх, нашто было графянку
Моцна так кахаці?!

VI.

І дзень і ноч у лёху цёмна,
І дзень і ноч глухі спакой,
І дзень і ноч ў цішы таёмнай
Ідзе нязьменнай чарадой.

Гадзіна гіне за гадзінай,
Штось ціха рвецца у душы.
Памалу, грозна і няспынна
Штось набліжаецца ў цішы.

Прыняць Янук усё гатовы,
Патухлі ўжо надзеі ўсе;
Сюды, у лёх, яму з падмогай
Ніхто, ніколі ня прыйдзе.

Ціха ночка плыла,
Ноч вясьняная,
І падмога прыйшла —
Нечаканая.

Адамкнула замкі,
Замкі моцныя! —
Пэўна спала тады
Варта ночная.

Ня дрыжала рука,
Рука белая,

Як вяла Янука —
Яна сьмелая.

Як вяла з пад зямлі
Лёху цёмнага
Гэнь да бору, туды —
Бору вольнага.

Толькі зоры адны
Любаваліся,
Як пад горкай яны
Разставаліся.

Разсталіся яны
Невясёлыя,
І пайшлі, хто куды,
Засмучоныя:

Да палацу яна
Надвазёрнага,
А яго павяла
Сьцежка зорная.

З вецярком асака
Мела клопаты,
Ўсё пра лёс Янука
Вялі шопаты.

Бор стары над вадой,
Поўны ўсполахаў,
Варажыў сам з сабой
Ціхім шолахам;

Варажыў, напяваў
Штось з трывогаю,
Ён ў сям'ю прынімаў —
Сына новага.

VII.

Можа чары хто кінуў на іх,
Апаілі мо' зельлем благім?
Гэты лёх вартавалі ў траіх
І заснулі адзін за другім.

Можа дух які з бору прыйшоў
Па душу яго грэшную сам,
Адчыніў ўсе замкі бяз ключоў
І нябачна украў яго нам?

Але хто-б яму там не памог,
Ці варожая сіла, ці Бог,
Тут — як хочыш — судзі, варажы: —
Вінаваты-ж у тым — старажы.

Самі ў лёху цяпер яны тым —
На вяльможны чакаюць прысуд,
І пагонь разаслана за тым, —
Пэўна хутка ён зьявіцца тут.

Пакорна, страхам ўсхваляваны
Цівун закончыў свой даклад,
І карак нізка, паслухмяна,
Сагнуў адходзячы назад.

Зьдзіўлёны граф вушам ня верыў:
Ці-ж гэта быць калі магло,
Каб хтось-ці з лёху выйшаў цэлы,—
Такіх выпадкаў ня было!

Ключы учора сам ад лёху
На ноч ў шуфляду ён паклаў, —
Ключоў зусім ня трэба Богу, —
І чорт з шуфляды іх ня браў.

Тут здрада чорная з парога
Ўпаўзла ў пакой яго сюды.
Ключы узяў, хто знаў дарогу, —
Ды недалёкі, і ня чужы.

З людзей адна толькі асоба
Адсюль ключы дастаць магла,
Яна харомы знала добра,
Дваццаты год у іх жыла.

І зельлем сонным напаіла
Яшчэ да варты старажоў.
І з лёху выпусьціла сына, —
Каб вольным ён у бор ішоў.

Ах, нашто такі
На душу лёг сум!
Граф! пакінь, пакінь
Кросны чорных дум.

Тая моц мацней
На'т за слуг тваіх,
Што вядзе людзей
Гінуць за другіх.

Ня будзі бяды,
Пакуль сьпіць яна,
На душу сваю
Не бяры граха.

Не жартуй агнём,—
Апячэшся сам,
Бо ня вечным сном
Сьпіць прыгоньнік-хам.

Бо за гэты чын,
Што задумаў ты,
Што адкажыш ім,
Як прыдуць сюды?

Не дарма такі
На душу лёг сум, —
Лепш пакінь, пакінь,
Кросны чорных дум!

VIII.

Рана, рана, раніцай,
Толькі згасьлі зоркі,
Ад палацу цягнецца
Слуг таўпа да горкі.

Узышлі на горачку,
Сталі нярухома,
Ціха штось гуторачы,
Штось трымаюць ў колу.

На гары глыбокая
Раскапана яма.
Ў падарож далёкую
Хтось ідзе ад пана.

Граф сягоньня смачнаю
Помстай сэрца цешыць,
За заслугі мамчыны
На'т ня будзе вешаць.

Як у графа водзіцца,
За заслугу тую
Загадаў на горачцы
Закапаць жывую.

Рана, рана, раніцай,
Да усходу сонца,

Той загад спаўняецца
Пры бары на горца.

Рэха хвалявалася
Крыкам прадсьмяротным.
Пад гарой шапталася
Асака з чаротам.

Сталі страхам скутыя
Людзі навакола,
Пакацілась смутнае
Рэха ў даль па бору.

Помрукам, пагрозаю
Задрыжэла пушча,
І пашлі па возеры
Хвалі густа, густа.

IX.

Ў палацы графскім, як ў магілцы, —
На душы лёг нялюдзкі страх,
Слуга слугу спаткаць баіцца, —
Ўсім сьніцца мука, сьмерць і граф.

А граф стары ў сваім пакоі
Тры дні бяз выхаду сядзіць,
Рабоў маўчаньне непакоіць, —
Уся ваколіца дрыжыць.

Душа абурана графянкі,
І бунт за страх ў грудзёх мацней.
Страшная сьмерць любімай мамкі,
Як камень, давіць сэрца ей.

І графу праўду ўсю адважна
Прызнаньнем кінула яна,
Што мамка згінула напрасна,
Што тут уся яе віна.

І граф ад злосьці азьвярэлы
Замкнуў у лёх дачку сваю —
За чын яе бунтарна-сьмелы,
За непакорную душу.

X.

Ой ня лебядзі ды сплываліся
На прастор, на шыр—гладзь вазёрную.
То разбойнікі ды зьбіраліся
У старым бары ночкай цёмнаю.

У старым бары, на палянчацы,
Разьвялі агні ды начлежныя.
Ой з усіх бакоў да іх цягнуцца
Бунтары-хлапцы — ой мяцежныя.

Ой ішлі сюды бунтам грэшныя,
Дзень і ноч каго думкі поркалі,
Каму сьцежкі ўсе сталі цесныя,
Як палын-трава, — жыцьцё горкае.

Разставаліся з вёскай — сёламі,
Разставаліся з сваей долячкай,
Ды нясьлі сюды крыўды з болямі,
Заручаліся з вольнай волячкай.

І гарaць агні —
на палянaчца,
На агнях — катлы:
Каша варыцца.
Навакол хлапцы
забаўляюцца,
Над сваей бядой
насьмяхаюцца;
Удальствам сваім
пахваляюцца,
На шалёны чын
ды зьбіраюцца.
Ой дайшлі сюды,
дакаціліся
Пра той страшны чын
весткі чорныя.
Падняліся ўсе,
абурыліся
Бунтары-хлапцы
непакорныя.
Кожны графам быў
чымсь пакрыўджаны, —
Усе крыўдачкі
тут падлічаны.

Закрынічыў гнеў
помстай лютаю,
За сваю, за ўсіх
долю смутную.

Ой ня лебядзі
ды сплываюцца
На прастор, на шыр —
гладзь вазёрную.

Не разбой, а бунт
разгараецца
У старым бары
ночкай цёмнаю.

Атаман сядзіць —
бровы хмурныя,
Ў цёмны бор глядзіць,
думы думае:

— Бор стары, скажы,
ці я здужаю,
Скалыхнуць усю
моц лапцюжную? —

Не на цёмны грэх —
чын разбойніка —
На сьмяротны бой
за нявольніка!

XI.

Няма, няма яму адказу, —
Маўчыць таёмны бор стары,
І толькі вецер недасказам
Шуміць: — Я з вамі — бунтары!

А з боку тут ля атамана
Сядзіць засмучаны Янук,
На твары сьвежа маляваны
Узор цяжкіх духовых мук.

Сярод разбойнікаў ён — братам,
З ім дружбу водзіць атаман,
Але чамусь зусім ня рады
Ад гэтай чэсьці наш Іван.

Ён лёс паставіў свой на карту,
Усю душу уклаў у бунт,
І справа стала ўжо ня жартам —
Ня сёньня, — заўтра запяюць.

Бор стары сьцяной,
Цёмны бор стаіць,
Пад палацам бой
Цэлы дзень кіпіць.

Скалыхнуўся люд,
Паднялася раць, —
На вялікі суд
Прыйшлі пана зваць.

Аб касу касой
Зазьвінеў мужык,
Пад муром-сьцяной
Гул і грозны крык.

— Мы прыйшлі усе,
— Адчыняйся пан!
— За ўсе крыўды трэ
— Палічыцца нам!

— Годзі, граф, бядзе,
— Сокі з нас смактаць,
— Мы прыйшлі табе
— Гэта тут сказаць!

— Больш ня страшна моц
— Страшных слуг тваіх,
— Будзе плакаць ноч
— Над касьцямі іх.

— Ўсё дабро тваё —
— Плёны нашых рук,
— Мы вазьмём сваё,
— Рукі прэч, павук!

Бор ды бор сьцяной,
Ў тым бары старым
Аж да хмар стаўбом
Над палацам дым.

XII.

Ня год, ня тры і не чатыры
З тае пары прайшлі вякі;
Жыцьцё крынічыць далі вірам,
Мяняе форму і шляхі.

Дзе бор сівы стаяў стагодзьдзі, —
Сягоньня там прастор палёў,

І толькі вецер з песьняй бродзіць
Па сьцежках хлопцаў - бунтароў.

Дзе быў палац — гняздо Лапаты —
Цяпер разваліна адна;
Там чарнабыль расьце касматы,
Дзяды, асот і лебяда.

На горцы сёньня — сосны - садам,
Магілка мамкі зарасла,
Але спытайся ў вёсцы радам, —
Завецца Мамчынай яна.

І кажуць людзі, што часамі,
Як месяц ў поўні над затокай,
Жанчына ў белі над саснамі
Сядзіць і думае глыбока.

А ў буры час, на горцы гэтай,
Як ветры з соснамі гудуць,
Хтось горка плача там. . і сьпевы
Жальбы сумуючай плывуць.

— — — — — — — —

Яшчэ легенда ўспамінае,
Што зьгінуў граф у бойцы тэй,
Аб' ім дасюль слава благая
Жыве у памяці людзей.

А бунт далей пайшоў па краю: —
Рабы ў пажарах і крыві,
У помсьце лютай і адчаю
Шукалі новы лад зямлі.

— — — — — — — —

Даруту вызваліўшы з лёху
Янук зноў кінуўся у бой, —
Шукаць ў змаганьню перамогі,
Ці заплаціць за ўсё сабой.

Калі-ж паўстаньне патушылі,
Хто жыў — у бор вяртаўся зноў,
Івана тут не далічылі,
Ў сям'і разьбітых бунтароў.

Адны казалі, што загінуў,
Другія — што з Дарутай
Кудысь за мора лёс закінуў
Шукаць сьвятляных сноў сваіх.

* * *

Легенды, легенды сівыя, —
Мінулае нашай зямлі, —
Курганы, магілкі старыя
Вам сховам вякамі былі.

Прыгожымі снамі сягоньня,
З далёкай, таёмнай цішы;
Вы з ветрам ціхім ў пераразвоне,
Вы ў шолаху траў на мяжы.

Вы вечарам сінім у змроку,
Як зоры дрыжаць над зямлёй,
Аднекуль здалёку, здалёку,
Зьлятаюць у мроі ціхой.

І шэпчаце чарамі байкі
Пра праўду калісьці жывых;
Пра тайны жыцьця бяз утайкі,
Пра дзеі адных і другіх.

Адны толькі вы непадкупны;
Бяз страху, трывог і маны,
І толькі у вас не патухлі
Вялікае праўды агні.

Канец.

Па дарогах і вёсках

Сонна ў жыце трашчалі конікі. Дакучліва ад аваднёў зьвінела паветра. А з сонца, як з пераверненай патэльні, лілася на ацяжэўшае калосьсе, і на людзей, і на вёску Гарыдаўку жоўтая, летняя гарачыня.

Часам дзьмуў з Нізкіх Дуброў вецер, дзьмуў асьцярожна ў кіпучае паветра і тады яно на міг астывала, каб зноў яшчэ гарачэй апаліць твар і кудлатыя грудзі Мікалая.

Ён, як смаляк, сядзеў сярод вуліцы, роўна калыхаўся ў такт нейкай падзёртай, як яго кашуля, мэлёдыі.

Голас яго быў востры, няпрыемны. І пеў, часамі, песьні, ад якіх старыкі доўга жагнаючыся аглядаліся.

— Ты, вось, Мікалай, не сядзіш на месцы. А гаспадарка твая што? Ішоў-бы служыць...

Неяк неспакойна варушыўся Мікалай. Часамі моўчкі адыходзіў, часамі ўхмыліўшыся спакойна гаварыў.

— У Сьвіры давалі пятнаццаць пудоў... Служыў у аднаго, у Падбродзьдзі, асадніка. Кінуў...

— Мне трэба парабка... Ідзі да мяне... — гавора Язэп — і хітра прыжмурыўшы вочы глядзіць нясьпелымі чарніцамі на рабы скляваны воспай твар Мікалая. Ты зусім ня рыжы, а чаму цябе завуць Рыжым?.. Арцель кажыш? Хэ-хэ! Відаць яна мацней за пана цябе ахрысьціла... А я даў-бы пятнаццаць пудоў. Ну, пару пудоў бульбы... кашулю...

— І да цябе я не пайду... Ты вось за пятнаццаць пудоў хочыш купіць цэлы год майго жыцьця. А ты ведаеш яму цану? Гэта яно і ёсьць, што ня ведаеш; самі — малая цана і другім даеш мала... Быў я летась у Будзе на кірмашы. Народу шмат, як калосься на полі... Ды адзін сьляпы іграў на скрыпцы. Сьляпы ад калыскі, а як іграў! Быццам пяць разоў пражыў жыцьцё і ўсё бачыў...

На загуменьні чуўся сьмех дзяцей ды суха пераклікаючыся заскрыпелі асьверы: гэта канюхі паілі коняй.

— А што з гэтага за толк, што другі шмат бачыў. Я далей мястэчка і не выяжджаў. Ведаю, што я Язэп — з кароткімі нагамі — не абыйду ўсяго сьвету. Хапіла-б на гэта поля і добра! — Раптам абарваў, як і пачаў неспадзявана гутарку Язэп.

— А мне здаецца: гоніш баразну, а на канцы ня хочаш заварачвацца, так і пагнаў-бы яе проста, пакуль хапіла-б сілы.

Недалёка, у грамадзе, пачуўся рогат. Нізкі, прысадзістый, з птушыным тварам, шырокаплечы батурынскі парабак Грышка расказваў, як у яго суседа ліцытавалі зямлю. Расказваў ён весела, шырака гледзячы, як кавалкамі неба, вачыма на слухачоў.

— ...Прыйшлі гэтыя госьці. Купец быў нібы амэрыканец. Ну баба, ведама, як баба! Адразу ў голас. А яны ўзьлезьлі на хату, тапаром па казлох. Падсеклі. Выгнулася маціца, зьехалі ключы, шаламя распаўзлося. А тут дзеці з хаты праз дзьверы з плачам сыпяцца, як гарох праз падзёртае рэшата. Дзяцей было шмат, а ўсе голыя. А як пачалі раськідаць бярвеньне, тут ужо і схапіліся за грудзі. Мо і ня было-б нічога, каб не знайшліся пад рукамі вілы. Так і падчапіў на ўсе чатыры зубы амэрыканца.

Здалёку вецер прынёс ці то шум калосься, ці адгалосак далёкай песьні.

Усе раптам змоўклі.

— Ці то з Нізкіх Дуброў, ці то з-за Перавалу, і чорт не разбярэ адкуль...

— Пэўне дзяўчаты пайшлі ў жыта...

Як чаўны плывуць цені хмараў па каласістым моры і як чаўны тонуць разьбіўшыся аб далёкую, чорную гару лесу.

— Летась я неяк бадзяўся каля Докшыц і каля Кабыльніку, — быццам прыслухваючыся да далёкіх успамінаў — загаварыў Мікалай. —

Сядзеў я тады ў арышце. Ехаў бяз білету ну і пасадзілі. Памятую, прывялі з Даўгінава нейкага пераводчыка, кантрабандай усё жыцьцё займаўся. Чалавек, відаць, бывалы, не якая небудзь шушла.

— Колькі я — кажа — перавёў праз граніцу людзей, не адну вёску засеяў-бы імі. Пераводзіў ня дзеля грошай. Дзеля грошай, нічога, брат, ня варта рабіць. Усіх не пазьбіраеш, а жыцьцё яны табе горш як вяроўкай завяжаць. Вось адзін палец згубіў каля Пагоста ў балоце. Стралялі, ну і адцяпалі чорту на соску... —

А дзе згубіў яшчэ два, так і ня было мне часу ў яго папытацца. Хутка яго забралі з маей цэлі...

На другі дзень прывялі палітычнага... Дробнай косьці, чорненькі, невялікі. Адна толькі бяда... Цэлую ноч прыкладаў я яму да плечаў і да грудзей і да ног — прыкладаў кампрэс.

— Я — кажа — ўжо пэўне ня выйду, ня выпусьцяць мяне хутка. Бяры мае боты, ты іх яшчэ паношываеш. —

Была тады вясна, одцепель, а мае лапці зусім растапталіся. Абуў я яго боты. Праўда, трохі за цесныя.

— Можа што дамоў, бацьком перадаць? — пытаюся...

Адвярнуўся. Доўга глядзеў ён мне ў вочы.

— Скажы — гавора, — хоць я бацькоў ужо даўна ня маю, скажы на вёсцы, каб па мне не бядавалі. Хай працуюць, не пакладаючы рук. Яшчэ збудуем шмат лепшае жыцьцё. Скажыш?..

Тут я і зразумеў, што толькі тыя баяцца сьмерці, хто ўсё сваё жыцьцё пражыў для сябе. Дзеля таго мо' і страшна ім так у апошнія часы. Аглянуцца назад — пуста, толькі пакінуў гару сьмяцьця на сваёй дарозе...

Ноччу яму быццам палепшала. Думаю: мо паправішся? Табе відаць яшчэ шмат больш трэба прайсьці вёсак, сьцежак і дарог, — шмат больш, як мне... Так я і ня ўзяў, і пакінуў яму боты. Праўда што былі яны ўжо палатаныя, але яшчэ добрыя. Міль дваццаць адмахаў-бы! Пад дзень заснуў ён, я яго і ня будзіў... Выпусьцілі мяне, тады я і пачаў служыць парабкам у Забалоцьці, посьле кінуў — пайшоў пад Вялейку, пад Маладэчна.

А вёску, пра якую ён гаварыў, ці мо' ён ня так сказаў, ведама хворы, ці мо' я забыўся, як яна называлася.

Шмат я посьле хадзіў, распытываўся: ці ні з вашай вёскі ўзялі чалавека?.. Але шмат было такіх вёсак, а яшчэ больш такіх людзей.

Шмат дзе расказваў. Слухалі,ківалі галовамі, часам паказываліся на вачох сьлёзы, часам мацней заціскалі далоні... Усякія ёсьць людзі!

Праўда, шмат дзе і мне за гэта дасталося. Посьле аб гэтым зусім гаварыць забаранілі...

Але ці ты патрапіш пагасіць сонца, устрымаць буру, ці злавіць і стаптаць тую песьню, якую толькі-што прапелі ў жыце дзяўчаты? Так і жыцьцё!..

Дрэміць вёска загараючы саламянымі стрэхамі, дрэміць пад гарачым сонцам прытуліўшыся да пераvалу...

Часам вецер смалістым пахам старога бору абвеіць хаты і прыгнуўшыся за вёскай папаўзе па межах шырока расхінаючы калосьсе...

А сонца, як залаты павук, падымаецца па сіне-залатым павуціньні неба вышэй і вышэй над полем, над калосьсямі, над вёскай.

Вільня, 10-VII-1936 г.

НАРАЧ

(Частка трэцяя)

1.

Іду, а дарога далёка, далёка
струною парванай няроўна лягла.
І сумна на сэрцы, хоць ногі так лёгка
ідуць ад сяла
да сяла.

Кудлатыя сосны расьцьвілі марозам,
пад небам шырокім, сьцюдзёным стаяць,
і шопатам ціхім плакучых бярозаў
гавора
Краіна мая.

— — — — — — — — — — — — —

— А ты, брат, здалёку?
— Здалёку, таварыш,...
здаецца ужо спатыкаліся мы,
а дзе? — не прыпамінаю... Махоркі ня маеш?...
ўсё-ж лепей цягнуцца дваім...
— І я цябе бачыў... мо' дзесь... на Лукішках...
Эх, краты, як хутка зьмяняюць людзей!
А я ледзь пазнаў! Прыглядаюся — Грышка!
Нат ў цэлі сядзелі аднэй...
Што-ж, даўна ты выйшаў?

— Вясною год будзе.
Вярнуўся дамоў — ні двара, ні кала;
сястра з меншым братам, вясковыя людзі
казалі, на службу пайшла...
Прыйшлі прывітацца суседзі-сяляне;
„што-ж — кажуць, — дакуль яшчэ будзем чакаць?
Варушацца, чуем, ўжо наднарачане, —
ня нам-жа ад іх адставаць!“
Пачаўся, жнівом, у нас штрэйк сэзановы,
ды... сіл было мала,
і мусіў я ноччу глухой верасьнёвай
зноў вёску пакінуць сваю..
Прыплёўся, як бачыш, і ў гэту старонку, —
да гэтых галодных вазёр, рыбакоў...
Эх! ты раскажы лепш пра Горадзень, Вронкі,
пра Вільню і таварышоў...

— Што-ж, вестак нямала, іх цэлы ахапак...
Спаткаемся можа яшчэ мы калі, —
на шляху няроўным, на доўгіх этапах
змаганьня за лепшыя дні...

— — — — — — — — — — — —

У полі адзін, паміж гурбаў высокіх
і поясам белым дарога лягла,
а ўдалі чарнеюць бярозы далёка
і родныя
стрэхі сяла.

За ветрам памалу, над сьнежнай раўнінай,
на сонца, з паўночнай ліхой стараны,
плывуць — бы з палову па возеры сінім —
на небе
ўдаль- хмары - чаўны.

2.

Сонца дзень шырэй расьцягвала
з захаду на ўсход;
з стрэх каралямі срабрыстымі
зьвісаў
узорна лёд.

Ішла одцепель з над возера —
там, дзе
гурбамі сьнягі,
дзе завеі, ветры польныя
зараўнялі берагі.

На крывой вясковай вуліцы,
на гнілы Сымонаў плот,
як вароны,
на пярэплаты
паналазіў так народ.

Крык і сьмех, і шум, і гутарка,
мора чорнае галоў.
Сход які мо' адбываецца
нарачанскіх рыбакоў?

— — — — — — — — —

— Пацягаліся і за грудзі, —
не адзін і сяньня хвор.
Сілай, браце, не адберыш
ні правоў і ні вазёр...

— Вам другое павалочнікі,
вам шкада больш галавы,
а у нас, з сям'ёй галоднай,
без вазёр ты пажыві!

— Ўжо і так нагаладаліся
. . . .
і апошнія ўжо хочаць
зьдзёрці з плечаў рызманы!

— Ўсё кармілі абяцанкамі,
абяцанкі, як аброк,
шмат каму яны ўжо сталі
ў горле косткай папярок...

Хадуном галовы буйныя
захадзілі хадуном... —
Прападаць дык прападаць ўжо,
а вазёры адбяром!..

3.

Часамі вецер
гэтак б'ецца ў вокны:
з размахам ўдарыць і бяз рэха змоўкне
і толькі ціша грозная пужліва
застыніць чутка перад новым зрывам,—
так гаварылі усю ноч з нядзелі,
так гаварылі быццам не арцелі,
а білі, рвалі свае путы - гора
вазёры: Нарач,
Мястра
і Баторын.

Архіп

Што-ж, не тапіць
нам сеткі, падвалокі,
і не ўцякаць-жа нам за край далёкі,
і не хадзіць нам з торбамі па сьвеце,
каб за вазёры праклінали дзеці,
шукаючы і працы і работы,
а без вазёр і самі мы сіроты...
Ды годзе ўжо
рыбацкімі плячамі
пакорна гнуцца нам . . . . . . !

Грышка

Вас шмат,
ды толькі навальніцай чорнай
вас топчыць, косіць, як трасьнік вазёрны,
як човен бурай крыша на атмелі.
Пара, рыбацкія арцелі,
супольнай сілай ўскалыхнуць дзень шэры,
абняўшы ...... надвазёрны бераг!.. —

Так толькі гаварыць маглі вазёры,
вазёры: Нарач,
Мястра
і Баторын...

Іван

Ды радзіць людзі языкамі будуць.
Паслухай толькі кожную прыблуду!
Ўжо шмат нам гаварылі і гавораць, —
хутчэй тапіцца пойдзем у вазёры.

З тлуму

Ты лепш накрыўся-б падалом сярмягі,
ці лепш паслухаў! Радзіць ён ня блага.

Сымон

Хоць малады, але, відаць, бывалы.
І кажа праўду: чорную навалу
супольнай сілай з плеч рыбацкіх скінем!
Усіх ня зломяць, ў грамадзе ня згінем!
Свой профсаюз каб залажылі ў восень, —
як радзіў нам, — дык сяньня ня прышлося-б
сядзець ў паўголад, ўсю зіму бяз солі. —
Вясной сьлязамі не засееш поля!.. —

Так білі ў бераг дзень і ноч вазёры,
вазёры: Нарач,
Мястра
і Баторын.

4.

Ёсьць на прадвесьні чароўныя раніцы,
ясныя раніцы, дні, —
ў сонцы срабрыста сьнягі загараюцца,
топяцца ў белым агні.

Часам з прыдаўленых, сумам ахопленых
вырвецца песьня з грудзей: —
ёсьць у жыцьці нашым зрэбным і стоптаным
шмат яшчэ ясных надзей.

Хутка падымуцца хвалі крынічныя, —
прыйдзе другая вясна,
. . . .
ўстанеш тады, Старана!

— — — — — — — — — — —

Чарнеюцца
гарбатыя
дзе-недзе берагі,
кладуцца цені захаду
на шэрыя сьнягі.
Сьмяецца
вечар спозьнены
званочкам пад дугой
і сыпляць зоры зорныя —
густы пчаліны рой.
Дзе - недзе
сіратлівыя
мігаюць аганькі, —
ня сьпяць, хоць працай змораныя,
штосьці рыбакі. —
Кранула
верхаводкаю, —
на лёдзе шмат вады, —
ім сьняцца хвалі сінія,
ім сьняцца невады;
трысьцё
пужліва-гібкае,
чарот у берагоў,
і першы срэбна-сіні іх
на возеры палоў...
І ціха
засыпаючы
чарнеюць берагі;

кладуцца цені захаду
на шэрыя сьнягі.
Сьпіць
вёска нарачанская
пад сіняю дугой
і сыпяць зоры зорныя —
густы пчаліны рой.

5.

Грышка

Вось неспадзявана прыплёўся да вас,
да вашых арцеляў учора...
Відаць не апошні і гэты папас, —
штось цягне мяне да вазёраў...

Спакойна у хаце лучына гарыць,
Тацяна маткі навівае;
Сымон сваю песьню на печы бурчыць
і лапці лазой падплятае.

Ад вас як я восеньню рана пайшоў
абіў ўжо нямала парогаў, —
адно сваё шчасьце ў змаганьні знайшоў,
другое — спаткаў на дарогах.

Спаткаў я яго, як цьвілі верасы, —
пра шчасьце гаворыцца ў казках, —
але я спаткаў яго з звонам расы,
апаўшай ў барох нарачанскіх.

Было яно, помню, як сон залаты,
як выраю крык на прадвесьні;
было яно, помню, Тацяна, як ты,
як Нарачы дзіўная песьня...

Тацяна

Ўжо позна... на гутарку час не такі.
А не, — раскажы што з былога...
Ды заўтра на сход мо пайдуць рыбакі,
ты лепш адпачыў-бы з дарогі...

А вецер калыша вясеньнюю ноч.
У хаце старэнькай і цеснай
бы з ветрам шуміць задажджыўшыся дождж
Сымона панурая песьня.

6.

„Былі калісь вазёры — быў хлеб і соль.
Нашы вазёры ўзялі.
Толькі засталася горкая голь
і на руках мазалі.

„Калышацца, ой гнуцца трасьнікі,
як бура хвалі вёсламі ударыць.
Бяз бою цябе, Нарач,
ня кінуць рыбакі!

„Змывала сіняй хваляй наш чорны пот.
І, ад вясны да вясны,
тысячы нас ты карміла сірот,
латала нам рызманы...

„Калышацца, ой гнуцца трасьнікі;
плывуць чаўны на сонечным загары.
Яшчэ убачыш, Нарач,
як ўстануць рыбакі!

„Над берагам вясеньне шумяць лясы.
Нарач падымецца зноў.
Крыльлем ўзмахнуць чаўнакоў парусы,
Ўдаль паплывём на палоў!..

„Калышацца, ой гнуцца трасьнікі,
зьбіраюцца навееныя хмары.
Мы буру любім, Нарач, —
з табою рыбакі!“

7.

Што-ж ня сьпіцца, Тацяна?..
Можа ноч без зарніц,
ноч вясеньняя,
дожджам чорным шуміць
за парканам?

Вецер мо' за гарамі
ў цёмным лесе між дрэў
заблудзіўшыся
зашумець зашумеў
галасамі?

Можа сны а паўночы
неспакойна снуюць?
Ці прысьніліся
ў гэту сінюю муць
чыесь вочы?

Эх, дарма, хоць спытаеш, —
аб чым ціха зьвіняць
зоры зорныя
і сасонкі шумяць, —
не згадаеш! —

Так дзявочыя мары,
думы, дзіўныя сны
нябывалыя...
Расьцьвітаюць яны
на загары,

раніцой на прадвесьні,
ці паўночнай парой,
нібы папарачь,
ці усходняй зарой,
можа песьняй?..

Канец часткі трэцяй.

Кромань — Вільня
28-VII-1936.

ІВАН КАМЕЛЬ

Суседы

Спаткаліся яны сярод натоўпу. Вачыма глыбака ўпіліся наўзаем. Ня ведалі, чаму шчапіліся ўзрокам, як два магутныя барцы. Змагаліся. Гарбаты ўсё-ж не паддаваўся. Ён першы ап'янелыя вочы перавёў на рампу.

Тэатр шуршэў натоўпам. Зашнураваны партэр і расхрыстаная галёрка пасвоему выражалі захопленьне гульнёй артыстаў. Ён ціха глядзеў на заслону. Шукаў на ёй разьвязкі драмы. Стараўся за людзей судзіць значэньне парушанай праблемы.

Гарбаты забаўляўся і шукаў лёгкага жыцьця. А ўсё-ж яны спаткаліся. І калі крэслы хруснулі пасьля гарачых воплескаў на заканчэньне, яны зыйшоўшыся з пасьпехам рукі падалі. Нічога ня пыталіся. Яму на ўсё адказ быў ясны:

— Гарбаты, лёсу жарт, людзьмі абходжаны, — так думаў Ён.

Гарбаты-ж бачыў чалавека, які заглянуў яму ў вочы і паказаў куток душы.

Ішлі, як блізкія, да хаты. Ціхія вуліцы маргалі лямпамі поўначы. Хмарнае неба ірдзела над горадам. Хацелася цяпла, спакою. Гарбаты йшоў да чалавека. Такое ўражаньне ён вынес з гутаркі. І не спрачаўся, калі Ён запрасіў яго на шклянку чаю.

— Дык вось, як ты жывеш? — сказаў Гарбаты, павёўшы вокам па пакоі.

— Жыву адзін, з мільёнам думак, — адказаў Ён, гледзячы на лёгкую пару, што косамі цягнулася з чаю. —

А ты? — спытаў Ён пачакаўшы.

— Безработны, — пачуў адказ. Вачэй Гарбатага ня бачыў. Іх пара схавала гарачага пасілку. Маўчалі. Думкамі ляцелі ў прастор на спатканьне гукаў мікрафону. А музыка лілася іскрыстым пералівам і хэўрай заліла малы Яго пакой.

* * *

Два прыяцелі ішлі кавалак часу праз жыцьцё. Бунтарная вясна, сьпелае лета, тужлівая восень...

— Як ты жывеш? — пытаў Яго і заглядаў Гарбаты глыбака ў вочы.

— Пытаеш ты? — шаптаў Ён ціха, — глядзі кругом на поле, вёскі, — я там жыву, хаця хаджу сярод рухлівага натоўпу места.

— Народ...

— Так, ён...

— Бывай, сягоньня ўжо пайду, — і працягнуў Гарбаты руку.

Гарачых рук спатканьне — і Ён ізноў адзін у пушчы думак.

— Пакрыўджаны і лёсам і людзьмі, — паўтараў Ён сваю думку.

* * *

Гарбаты п'е музыку грашовых зьвякаў. З рукі на руку пераложыць і вокам ліжа блеск манэты. Глухі на голас сэрца, ідзе Ён да яго. Спаляючы ў сабе пачуцьці, вітае ў тэрцыю вышэй:

— Жывём з табой сягоньня мы... Хачу эмоцыяў і шчасьця... З табой знайду я ўсё...

І горб Яго пачаў здрыгацца, тапіцца ў плечах, калі рукамі сыпаў серабро.

— Глухі на гэта я, — казаў Гарбатаму.

— Але прыяцель мой, — цягнуў Гарбаты.

І Ён пайшоў. Блеск... Музыка... Гоман...

* * *

— Пашто хадзіў я? — пытае Ён сябе.

— Пашто зрабіў я!.. — шэпча Гарбаты.

І кожны засыпаў з няроўным рытмам сэрца. Гарбаты чуў праз сон, як зьвінела серабро. Яго-ж збудзіў зьвяк сталі. Бяз слова скаргі, як лунатык, ішоў канчаць свой сон наяве.

* * *

Шуршыць папера. Скрып пяра. Усё пішуць... пішуць... пішуць... А Ён у квадратах мерыць неба.

* * *

Зялёны колер да болю рэжа вочы. І стол, як поле зелянее. Над ім сагнуўшыся, рукамі паперы пісанай лісты перакладаюць жрацы кадэкснай праўды. Пытаньні выстралам лятуць, а Ён адбіць ня мог атаку, хаця ня мала меў саюзьнікаў там, збоку.

Адныя вочы рэзалі Яго вагнём. Шукаў у іх прыязьні, а бачыў штось, чаго не разумеў. Разьвязка хутка надыйшла:

— ...на пяць гадоў... — пачуў апошні прыгавор. І словы з-за зялёнага стала, як гром, зьніштожылі свабоду. За імі з салі, як-бы рэха, адбіліся з цёмнага кутка:

— Не, не. То я зрабіў, за грошы... То выдумка была!..

* * *

Зелень шумам разьлівалася і затапіла сэрца, дзе прыязьнь асная цьвіла. Схапіў рукамі белы твар. Паветра кашай цякло ў грудзі. У вушох зьвінела: пяць гадоў і два Гарбатага.

* * *

Два нумары: адзін на пяць, другі на два... Між імі цень памёршае прыязьні...

Вільня, жнівень, 1936 г.

М. ВАСІЛЁК

Маўчаць дубы

Праз сэрца я пачуцьці працаджу,
Каб кроў мацней у жылах пульсавала,
Хоць хмары паўстаюць, хоць чорнаю навалай
Гразяць — я сьмела ў даль гляджу —
Яна ўжо заваёваная намі!..

Шчыльней, шчыльней сталёвымі радамі —
Грудзям працоўным душна ў падзямельлі!..
Над паўшымі капцы нам сьвецяць маякамі —
З нядоляй, што смактала кроў нашу вякамі.

Бязстрашна распачаць!
Гэтак магутныя дубы маўчаць,
Лісьцём дрыжаць ледзь кволыя асіны,
Калі паўзе па небасхіле мрок пануры, —
Сьпякота паліць твар і душу... Так прад бурай
Маўчаць дубы ў задуме сіняй.

Бабруйня, 1936 г.

* * *

Пяю, каб каменьні нат чулі,
Б'ю песьняй, як хвалямі ў моры, —
Даволі каркі свае гнулі
Пад цяжарам горкім ў пакоры.

Гнілое руйнуем мы сяньня
І творым красу новых дзён,
Імёнаў каб нашых ня зганьбіў
Жывых пакаленьняў праклён!

Ад. СТАНКЕВІЧ

З жыцьця і дзейнасьці Казімера Сваяка

(у дзесятыя ўгодкі яго сьмерці)

1926 — 1936

Казімер Сваяк — беларускі паэт і дзеяч — займае ў беларускім адраджэнскім жыцьці сусім арыгінальнае, асобнае месца. Ужо толькі дзеля гэтага варта беларускаму грамадзянству і народу бліжэй з ім знацца. Да таго-ж сёлета 6. V. мінула роўна 10 гадоў ад яго сьмерці, а ў архіве знаходзяцца дагэтуль нявыкарыстаныя аб ім весткі, асабліва ў яго „Хроніцы Хаўрусу“. Вось-жа гэтыя жалобныя ўгодкі няхай паслужаць нам нагодай бліжэй пазнаёміцца з жыцьцём і дзейнасьцяй Казімера Сваяка.

Казімер Сваяк — гэта літаратурная мянюшка. Праўдзівае яго прозьвішча Кастусь Стэповіч. Радзіўся ён 19. II. 1890 году ў вёсцы Барані, Сьвянцянскага пав. Сын сялян паўвалочнікаў. Да 1900 году жыў пры бацькох, памагаючы ім у гаспадарцы, як пастушок. Некаторы час бацькі яго жылі ў вадным засьценку, як арэндатары. Як Барані, так і той засьценак, знаходзіліся ў глухім лесе. Лес, сваей красой і таёмнасьцяй, і так ад прыроды уражлівую душу будучага паэта, настрайваў і вырабляў на мастацкі, філёзофічны і містычны лад. Да далейшага развою душы яго ў гэтым-жа кірунку спрыяла яго бабка і стары пастух Марцін, якія расказвалі яму беларускія казкі і пялі такія-ж песьні. У гэтым часе Казімер Сваяк скончыў расейскую пачатковую школу.

Час свайго раньняга дзяцінства ўспамінае Сваяк пасьля з тугой і расчуленьнем:

„Далёка ты, родная старонка, ад мяне...

На крыльлях хмарных ляціць мысьль мая туды, дзе я ўбачыў сьвет, дзе айцец мой дарагі, дзе маці мілая, дзе сястрыца родная. Родзяцца во думкі: то сьветлыя, як вясеннае сонца над роднаю вёскай, то сумныя, як тая ночка цёмная, сьлязьлівая, восенная...

Прад вачамі стаіць уся прошласьць, што мінула як бліскі сьвятла, на векі згаснутага... Ня вернецца ніколі... Штодзень, што-момант далучаецца да яе новая хваля і... прападае вечна. Ах, шчасьлівы той, што збудаваў сабе стройную, горную мінуўшчыну... Чаму я неспакойны, чаму бязвольны?!..

Дарагі! Сабяры сілы духа... Стаў прад сабой усё, што прайшло... Будуй новае, што-раз высшае жыцьцё!..

* * *

Шуміць цёмны лес навокал Гаруноў, малой вёскі беларускае. Кругом ні жывой душы. Зрэдка толькі адзавецца зьвяга сабак вясковых, што чуюць ваўкоў. Людцы сьпяць адны, другія кончаць вячэру. У хаце апошняй, пры самым лесе, мігціць праз акно агоньчык.

Дзеткі акружылі навокал бабулю і слухаюць пільна казкі. Усе ўжо расходзяцца спаць. Ім толькі не да сну, бо якраз байка ідзець аб самым цікаўным: „Крыся абярнулася ў вадзянку і жывець у азярку. Што-дзень чуе яна голас жалосны з берагу — Крыся, Крыся, маладзян плачыць... Што-дзень адзываецца яна з жвіраватага дна. — Іду — бягу, раса вочкі залівае, жвірок ножкі падбівае“...

Слухалі дзеткі казкі - песьні. Аж заміралі з ахвоты даведацца, чым гэта кончылася, аж блішчэлі іх вочы. І ў ночы пасьля пяялі яны ціхутка праз сон: „Крыся — Крыся! — Іду — бягу”... Шчасьлівае дзяцінства! Якжа яно жыва запісалася ў маей памяці! Няма ужо тэй бабулі. Зьмяніла яе новае пакаленьне. Забыліся аб ёй чуць ня ўсе. Ах, вечны табе спакой, родная! Прыдзі хоць у сьне йшчэ да мяне...

*

Помню ноч. Сям’я наша тады была падзелена. Часьць жыла ў Гарунох, а часьць у глухім засьценку Загінца. У засьценку жыла старушка, брат і я. Брат пасьвіў. Прыгналі раз дамоў. Прышла жывёла — брата ня было: прапаў недзе. Бабуля ня спала і плакала поўна неспакою. Лес быў кругом вялікі, з балотамі, гушчарамі, хмызьнякамі. Вадзілася многа ваўкоў. Што-ноч чуваць было іх завываньне; навадзіла яно і адважнаму дрыжачку на плечы... Цёмна. Поўнач. Алеся няма...

„Найсьвятша Матка да касьцёла хадзіла,
Сваё Дзіцятка за ручку вадзіла“ —

мовіла бабуля свае пацеры голасам плачлівым і безнадзейным. Мне было страшна. Утуліўся глыбока, закрыў вочы і вушы і... заснуў здаровым дзіцячым сном. Назаўтра з зарой брат вярнуўся. Начаваў пры агні ў лесе, не баючыся ні ваўкоў, ні благіх людзей...

Незваротны час! Якжа я тады блізкі быў прыроды, як зжыўся з шаптуном-борам, з зялёным гаем, кветным лугам! Быць любіў і пад навальніцай — громам і пад гарачым сонцам і на балючым марозе. Якое здароўе біла з майго твару!.. А цяпер!..

*

Цэлую ноч гудзела мяцеліца, гонячы сыпкі сьнег і насыпаючы гурбы. Цяжка дзеткамісьці ў школку, завеена дарога няблізкая, а і мароз шчыпае вушы. Але мы ў поце,

з румянымі тварамі бяжом праз насыпы, лезем праз гурбы— сьмешна неяк і лёгка. Радосная пара! Як доўга помніцца верш, навучаны на памяць! Як доўга стаіць у вачах вучыцель суровы, што мерыў злосна ўдары лінейкай „бяздай прычыны!“ У імгле мінуўшчыны ён здаецца лепшым і болей людзкім. Мімавольна забываесься, што ён быў п'яніца горкі і маскаль наравісты... А які вясёлы быў паварот з школы! Далёка сьлізгаліся па гладзенькім лядку; прыжмурыўшы адно вочка, паказвалі язык дзяўчынкам, чапалі шалуцькавата кожнага сустрэчнага, празывалі і сьмяяліся з боўдзелаў і злых сяброў. Дзе-ж было дзець тую жывасць і энэргію дзіцячую, што як ручай рвалася разьліцца? Напрасна хацелі судзяржаць нас старшыя, называючы „распусьнікамі“... Мы свае права мелі...“ *)

У 1900 годзе Казімер Сваяк паступіў у гарадзкую школу ў Сьвянцянах, якую скончыў у 1905 г. І гэты час успамінае ён у тэй-жа сваей „Дзеі“:

„Гразка было ехаць да павятовага места, дзе меў я зачаць свае навукі па скончанай людовай школцы. Конь ледзь цягнуў воз, у каторым сядзеў пахмурны бацька і я маўклівы, задуманы. „От, дарога цяжкая, адазваўся ўрэшце бацька— глядзі, каб не пашлі намарна гэты труды і захады“. Я маўчаў. Баязьлівы мой характэр быў прычынай цяжкіх мысьляў, поўных неспакою і прачуцьця нявыясьненага...

Эх ты сьветазарная дарога навукі! Сьвеціш ты маладой душы, як ясны месяц сярод майскай ночкі. А ўвойдзеш у тваю краіну, адкрываюцца штораз новыя сьветы, новыя зоры, неразгаданыя, недаступныя! Вось-вось ухваціш адзін праменчык, нацешысься ім, раз'ясьніш цемру быту, аж зьяўляецца другі, трэці... і сілы ападаюць, аж маркоціцца твая істота і малее, разумеючы, што кароткае жыцьцё Бог даў для пазнаньня, або што пэўна ня тут нам угадаць усе тайніцы быту, — трэба адмены цэлай істоты“ **).

1905 год — гэта год першай расейскай рэвалюцыі. Чуткая душа Сваяка ўжо шмат што бачыла недарэчным у грамадзкапалітычным жыцьці Беларусі пад панаваньнем расейскай імпэрыі, а гэта рэвалюцыя яшчэ больш адкрыла яму вочы. Рваўся ў сьвет, да навукі.

„Ідэалам маіх добрых бацькоў — кажа Сваяк — было відзець мяне ў духоўным стане. І я пайшоў па лініі жыцьця, якая мне здавалася найпрасьцейшай і якая была здаўна ў матчыных снох“ ***).

---

*) Каз. Сваяк—Дзея маей мысьлі, сэрца і волі. Вільня, 1932 г., бач. 3—5.
**) Там-жа, бач. 6.
***) Ад. Станкевіч — Казімер Сваяк. Нарысы аб ягонай ідэолёгіі. Вільня, 1931, бач. 9.

У 1906 і 7 г. Сваяк прыбывае ў Вільню і рыхтуецца ў Духоўную Сэмінарыю.

„Помню дзіўны мамэнт. Я прыехаў у Вільню з дарагім сваім айцом. Зайшліся ў катэдру, бацька дзеля Бога, а я сам ня ведаю дзеля чаго: маліцца я ня мог...

Бацька апусьціўся на каленкі і пачаў свае малітвы. Сэрца маё забіла трывогай. Прад вачамі стаяла будучыня неразгаданая, тайнічная. Здалося мне, што лёс мой нятолькі ад мяне залежны. Агляд Прадвечны Бога мусіць быць над кожным. Чаго Ён ад мяне жадае?.. Ці Ягоная помач мне не патрэбна?.. Я хацеў высокага зразуменьня і вялікіх учынкаў. Мысьль мая аднак спакарнела, відзячы сваю слабасьць і зьменнасьць... Я маліўся". *).

Тут першы раз пазнаецца ён з беларускім адраджэнскім рухам, спаткаўшыся з „Нашай Нівай".

Урэшце ў восені 1908 г. і ў наступных спатыкаем Сваяка ў Духоўнай Сэмінарыі ў Вільні. Вось што ён аб гэтым піша:

„Праз тры гады сэмінарскіх студыяў я працаваў ня помнячы аб Божым сьвеце, аж на чацьвертым цяжкі сэмінарскі сыстэм зламіў мяне: я мусіў выехаць у горы, каб ратаваць сваё здароўе. У гэтым часе аддаў я ў рэдакцыю „Беларуса" першыя свае творы *„Прад Богам"* („Беларус" № 28, 1913 г.) і пачаў адтуль працу ў розьвітку беларускай народнай ідэолёгіі. — Прабыў зіму 1912 і 1913 г. у Закапаным і з гэтай прычыны толькі вясной 1915 г. высьвяціўся на ксяндза ў Петраградзе" **).

Ідэолёгічныя Сваяка заінтэрэсаваньні ў гэтым часе відзім з наступнага яго ліста да брата з 1. IV:

„Рух палітычны ці наагул грамадзкі мае падклад этычны, дык у такіх перасіленьнях, якія мы перажываем, ці-ж можа быць душа чалавека спакойнай? Адраджэньне мовы нашае і то мае сувязь з справамі этыкі, бо ці-ж падклад яго ня вяжыцца з пытаньнем: „можна, нельга?" Соцыялізм ня можа ня ўмешывацца ў справы натуры рэлігійнай, бо этыка і рэлігія — дзьве сёстры неразлучныя і абедзьве ў натуры чалавека. Мы павінны дайсьці да выснаву, што калі адкінем хрысьціянства з руху нашага народнага, то ён, гэты рух, расплывецца ў золкай міжнароднасьці і этычнай развязласьці. „Не пакідайма мовы роднай, каб ня ўмерлі". Не пакідайма рэлігіі глыбокай нашай, каб не загавець душой..." ***).

*) Казімер Сваяк, там-жа, бач. 8.
**) Ад. Станкевіч, там-жа, бач. 9.
***) Казімер Сваяк, там-жа, бач. 20.

Беларуская сьведамасьць і беларуская ідэолёгія ў Сваяка разьвіваецца далей. У 1913 г., вярнуўшыся з Закапанага гэтак ён піша:

„Жнівень—1913. Ад даўнага часу чую да цябе, маці Беларусь, асаблівую прывязнасьць — і болей чым прывязнасьць: надта гэта адчуцьцё глыбока зарылася ў сэрцы—пэўна гэта міласьць, каханьне з сэрца. Люблю я цябе і сільна люблю. Аб'ехаў я нямала ўжо сьвету, шукаючы красы і праўды, а найбольш бачу тэй і другой у сваім родным краі, у сваей мілай зямельцы. Стройны горы і даліны ў Татрах, прыемны малюнкі ў зямлі Кракаўскай, а ўсё ж цуднейшы наш бор вяльможны, пякнейшыя роўні і гаі нашы: страйнейшыя, бо гаворaць проста да душы тваей, а мова іх пранікае цябе цэлага, лечыць раны сэрца твайго. О, хараство тут неапісанае, бо роднае, простае — як душа русьняка. Ты, браце, беларусе, выдаешся мне лепшым ад другіх народаў. Ты пакрыўджаны і нешчасьлівы, пакінены праз многа сваіх родных сыноў і дочкаў, аддадзены на зьдзек чужынцаў — і то здаўна — ты бедны, гаротны. І тут пэўна ляжыць прычына, чаму ты так блізкі сэрцу і душы маей. Цябе не сказіў фалш, не ляжыць на тваіх плячах крыўда чужая: свая толькі ўрэзалася крывава на іх і хіліць цябе да зямлі. Праўда і шчырасьць жыве йшчэ ў душы тваей — недарма-ж называюць цябе „простым“, даючы спазнаць, што другія народы здаўна ўжо скрывіліся. Пазнай толькі добра, хто ты, гарніся да прасьветы, а станеш сільным: а гэта сіла дасьць волю духу твайму, так цяжка загнанаму і пакрыўджанаму...

Не хачу я пакінуць цябе, маці Беларусь, хоць тутка мус скажа ізноў разьвітацца з табой. Хачу служыць табе, хачу аддаць сябе для дабра душы тваей. А яна — душа твая — чакае афяраў. Патрэбны афяры, калі мае прыйсьці выбаўленьне. Я не пайду шырокім разгонам людзкога рахунку. Я хачу толькі служыць тваім патрэбам, беларусе. А яны аграмадны. Сапраўды сказаць трэба: „Жніво вялізнае, а працаўнікоў мала“. Божа, дай мне зразумець і ўпэўніцца, якой жадаеш ад мяне службы? Аддаючыся найбліжэйшым братом маім, я хачу споўніць Волю Тваю, шукаць праўды і нясьці знайдзеную другім.

13 жніўня. Сягоньня слухаючы звон наш цудны касьцельны, раблю пробу аддаць уражаньне вершам. Папольску пішуць усе. Беларус—сірата: сьмяюцца з яго мовы. Я люблю бедных, апушчаных... Буду пісаць п а б е л а р у с к у. Мова беларуская ёсьць гладкай і згучнай: можа служыць і да паэзіі (але сам сябе я да паэтаў залічыць ня важуся). Пастараюся выгладзіць стыль свой беларускі. Згодзіцца ў будучыне“ *).

*) Казімер Сваяк: Там-жа, бач. 30—31.

А вось урэшце надыйшла і сусьветная вайна, якая ў 1915 годзе нахлынуўшы на Беларусь падзяліла яе на дзьве часьці: адну часьць (заходнюю) занялі немцы, а другая (ўсходняя) падаўнейшаму асталася пад Расеяй. Галоўным асяродкам беларускага адраджэньня, як ведама, была тады Вільня. Вось-жа нямецкая окупацыя Вільні і значнай часьці нашага Краю працу гэту, рэч зразумелая, спыніла. Газэты „Наша Ніва“ і „Беларус” выходзіць перасталі, выдавецтва спынілася, беларуская інтэлігенцыя разьехалася. Але так дрэнна было толькі ўпачатку. Хутка ўзноў пачалі тварыцца беларускія асяродкі і ў меру магчымасьці як у Вільні, так і на правінцыі, пачалася сякая-такая беларуская праца.

Вось-жа з такіх працаўнікоў на беларускім сяле першае і бадай адзінае мейсца займае наш паэт і народны ідэолёг Каз. Сваяк. Вайна ў 1914 г. застае яго ў Клюшчанах, Сьвянцянскага павету, у роднай ягонай парафіі, дзе ён з прычыны хваробы чакае на сьвяшчэнства. Ужо ў гэтым годзе (29-XI) ён арганізуе касьцельны хор, які пяе так-жа і песьні беларускія.

У 1915 г. Каз. Сваяк як вікары прабывае месяц у Камаях, а пасьля ў роднай парафіі і далей працуе для беларускай справы. Хор яго, склад якога даходзіў да 40 асоб, разьвіваецца і апрача беларускіх песьняў ладзіць так-жа і беларускія лекцыі. Так напр. гэты хор, сьвяткуючы свае першыя ўгодкі 2-XII-15 ладзіць ужо лекцыю „аб беларускай песьні“, напісаную самым Сваяком, а прачытаную адным з сябраў хору.

У гэтым-жа 1915 г. Каз. Сваяк, праводзячы беларускую народную працу, прабуе мову беларускую заводзіць і ў казаньнях у касьцеле, як гэта было 21-XI.

У 1916 г. беларуская праца ў Клюшчанах пад кіраўніцтвам Сваяка яшчэ больш паглыбілася. Дайшло і да беларускіх школаў. Калядамі 1915 г. былі арганізаваны пад кіраўніцтвам Сваяка беларускія вучыцельскія курсы, а ў 1916 г. было заложана сем беларускіх школаў, у якіх малодшыя дзеці вучыліся пабеларуску, а старшыя побач з мовай беларускай вучыліся і мовы польскай. Школы гэтыя былі пасьля польскімі ўладамі закрыты.

Беларуская праца Каз Сваяка набірае штораз больш размаху і разгалосу і штораз больш страша польскіх паноў, якія шлюць ужо на яго скаргі ў Вільню да каталіцкай духоўнай улады за тое, што ён „беларусіць“ Клюшчанскую парафію.

У тым-жа 1916 г. Каз. Сваяк заснаваў арганізацыю беларускай моладзі пад назовам „Хаўрус Сваякоў“ (CHS), якая фактычна вырасла з успомненага хору.

Працу сваю „Хаўрус“ вёў бойка. Вось што аб гэтым піша Сваяк:

„Гарой, гарой тутэйшая моладзь! зладзілася ідэйная першая забава-прадстаўленьне. Перашкод прыйшлося зламаць дужа-многа. Але ў канцы ўсё ўдалося. На сцэне стала „Пра-

клённае зельле“ *) — жывы драматычны абразок з нашага вясковага жыцьця. Забава падчас, калі за вёрст сорак грымяць гарматы! Аднак яна была патрэбай. Дух адпачыў і зажыў хоць на крыху новым жыцьцём“... **).

Да рэчы тут будзе адзначыць, што гэтае прадстаўленьне ў Клюшчанах было першае на беларускіх землях, што цяпер ляжаць на захад ад савецка-польскай граніцы.

Узноў-жа, як бачым з „Хронікі Хаўрусу“, моладзь ладзіла так-жа беларускія лекцыі. Лекцыі такія на тэму аб узгадаваньні характару адбыліся яшчэ ў тым-жа 1916 г.: адна 30-VII, а другая 6-VIII.

У палавіне 1916 г. Каз. Сваяк быў назначаны ў Карыцін (Беласточчына), дзе прабыў да вясны 1918 г. Але ня гледзячы на свой выезд з Клюшчан, зносін з тамтэйшай моладзяй на грунце беларускай ідэі не парваў. З выбітнейшымі сябрамі „Хаўрусу Сваякоў“ ён вёў перапіску, у якой падтрымліваў у моладзі беларускі дух, заахвочваў яе далей вясьці распачатую працу і адначасна даваў рады, як гэту працу далей праводзіць. І праца сапраўды йшла.

Не забываўся аб „Хаўрусе“ Каз. Сваяк у Карыціне і кіраваў ім праз пісьмы, а да таго былі ўжо з „хаўрусьнікаў“ некаторыя адзінкі настолькі ўзгадаваныя і вырабленыя, што і самі патраплялі далей працаваць на беларускай ніве. Адным з такіх вясковых інтэлігентаў-дзеячоў, узгадаваных Сваяком, быў Адольф Клімовіч, цяпер інжынер-аграном, адзін з ідэолёгаў сучаснага беларускага адраджэньня, выдатны ідэйны беларускі народны дзеяч.

„Хаўрус Сваякоў“ трымаўся і працаваў гады тры. Працу сваю праводзіў пераважна пры помачы беларускіх кніжак, якіх было нямала ў хаўруснай бібліотэцы і якія шырока йшлі ў сялянства. Урэшце „Хаўрус“ распаўся з прычын ад яго незалежных. Прадусім ад 1918 г. Каз. Сваяк, моцна надарваўшы ў Карыціне здароўе, ня меў больш сілы хоць духова кіраваць „Хаўрусам“. Урэшце-ж 1919—20 год — гэта час вайны літоўска-польска-бальшавіцкай, час, калі немагчымай была ніякая арганізацыйная, ідэйная праца, а тымбольш праца беларуская.

Як Каз. Сваяк цаніў „Хаўрус Сваякоў“, як на яго глядзеў, сьведчыць наступны яго верш:

Хаўрусу Сваякоў у Клюшчанах.

Гадкі са тры дзяржаўся ты удала,
Старонцы роднай ўсё стараючысь служыць;
Як мо- і як умеў: ня быстра, ані вяла —
Змагаўся русьняка з прасоньня разбудзіць.

* * *

*) П'еса Каз. Сваяка, пасьля ім-жа пераназваная „Янка Канцавы“.
**) Каз. Сваяк — Дзея, бач. 44.

Так думцы вось тваей хай багаславіць Бог,
Каб буйна узрасла для Бацькаўшчыны роднай;
А помні, брат Сваяк: Наперад бяз трывог
Ідзі ўсё дальш і дальш па пуціне свабоднай.

* * *

А есьлі-ж пуціна калючкамі наб'ецца, —
Ня бойся толькі ты, абы ісьці ледзь мог;
Бо пэўна нас калісь нямала сабярэцца:
Сапхнём тады карчы з усіх сваіх дарог.

Казімер Сваяк
24. IX. 1919.

Перабраўшыся ў канцы 1916 г. на вікарага ў Карыцін, Каз. Сваяк прабываў там да пачатку 1918 г., дзе так-жа разьвіў значную беларускую працу. Праца гэта яго ня была там лёгкая: травіў яго за гэта пробаршч (паляк) і пісаў у Вільню даносы, а тымчасам і сухоты няміласэрна грызьлі яго грудзі. Вось-жа Казімер Сваяк у беларускай там сваей працы прымушаны быў агранічыцца да шырэньня сярод беларускага сялянства, што знаходзіцца на рубяжы з польшчынай, беларускай народнай сьведамасьці словам і праз кніжку і пры тым спосабам магчыма тайным, крыючыся ад вока сваіх ворагаў.

Вось што аб гэтым чытаем у тэй-жа Сваяковай „Дзеі":

...„У парафіі Карыцін большасьць беларусаў гавораць чуць ня ўсе пабеларуску. Гутарка мала розьніцца і ад нашай надвялейскай. Ідэя маладой Беларусі тутака нязнана" *).

...„Запяяў я „тутэйшым" колькі шчырых песьняў беларускіх, сказаў пару казкаў, задэклямаваў „Званара" і даў прачытаць „Пчалінку"... Сяньня пры абедзе мой пробаршч зьнячэўку пытаў: „хто гэта даў да чытаньня беларускую кніжыцу, што чытаюць у мястэчку, сабраўшыся вечарам?" Адказаў я, што гэта мая работа. — „Няхай ксёндз не заводзіць тутака ніякай новасьці. Прашу ня шырыць ані песьняў, ані казкаў, ані дэклямацыяў беларускіх!" Пробаршч пасьля высьніў, што гэтага вымагае касьцельная палітыка з Вільні" **).

Урэшце ў тэй-жа „Дзеі" чытаем: ...„Нездаволены (пробаршч) найгорш, што зрадзілася тут думка аб Беларусі не бяз майго удзелу" ***).

Уканцы, зламаны фізычна (хваробай) і маральна (прасьледам з боку паляка пробаршча), Каз. Сваяк пакінуў Карыцін і ўдаўся ў Закапанае. У другой палавіне 1919 году варочаючыся з Закапанага спатыкаем Сваяка ў Лапеніцы, Ваўкавыскага пав., дзе быў пробаршчам беларускі адраджэнец і пісьменьнік кс. Я.

*) Каз. Сваяк — Дзея... бач. 51.
**) Каз. Сваяк, там-жа, бач. 53.
***) Там-жа, бач. 57.

Гэрмановіч, які так-жа ідэйна працуе на беларускай ніве, гаворачы беларускія казаньні ў касьцеле і арганізуючы беларускія школы. Вось-жа ў гэтай працы кс. Гэрмановічу памагаў і Каз. Сваяк.

Урэшце Каз. Сваяк ад 1920 да 1926 г., ужо за часоў польскіх, гэта знача аж да сваей сьмерці, прабываў на перамену то ў Закапаным, то ў Засьвіры, Сьвянцянскага пав., дзе быў пробаршчам і дзе, ня гледзячы на поўную руіну ягонага здароўя, на ніве беларускай, у галіне ўсьведамленьня народнага, даканаў яшчэ нямала.

За гэта польскія ўлады ня мелі да яго сэрца. Былі рэвізіі, дамашні арышт, а так-жа арышт рукапіснай беларускай літаратуры. Але гэта ўсё яго не застрашыла і ад роднай працы не адцягнула.

Урэшце трэба адцеміць, што Каз. Сваяк, як ведама, праз увесь дасьпелы час свайго жыцьця, апрача працы беларускай грамадзка-народнай, працаваў на ніве беларускай літаратуры, якая сапраўды была галоўным прадметам яго працы і ў якой ён пакінуў цалкам паважныя сьляды.

Пасьмертная літаратурная спадчына Сваяка агулам даволі значная. Многія з твораў ягоных ужо выйшлі друкам і сталіся ўласнасьцяй беларускага грамадзянства і народу агулам, а многія яшчэ ляжаць спакойна ў рукапісах і чакаюць на свайго выдаўца.

Да друкаваных ужо твораў Сваяка належаць: „Мая Ліра“ (зборнік вершаў), „Голас душы“ (малітаўнік для беларусаў каталікоў), „Чарку дай, браце...“ (філёзофічна-этычнае апавяданьне вершам у дусе хрысьціянскім), „Янка Канцавы“ (вясковая драма ў пяцёх дзеях), „Алькаголь“ (нарысы аб шкоднасьці алькаголю), „Купальле“ (фантазія-містэрыя, аснутая на беларускай мітолёгіі), „Дзея маей мысьлі, сэрца і волі“, многа вершаў, твораў поэтыцкіх прозай, афорызмаў, артыкулаў, разважаньняў і г. д. друкаваных ў „Беларусе“, „Крыніцы“, у каляндарох і інш.

Да недрукаваных дагэтуль твораў Сваяка належаць наступныя: аб рэлігійнай уніі на Беларусі (філёзофічныя і гістарычныя нарысы), вершы, філёзофічна-рэлігійныя разважаньні, праекты і спробы вершаў і г. д. Урэшце корэспондэнцыя ў польскай мове з паняй Ядвігай Банцэр на тэмы філёзофічныя і рэлігійныя.

Жадаючых бліжэй пазнацца з характарам літаратурнага творства Сваяка адсылаю да сваей кніжыцы: „Каз. Сваяк“.

Тут-жа, як аб дзейнасьці Каз. Сваяка агулам, так і аб яго паэтычным і літаратурным творстве, прыгледзімся толькі збольшага і агульна.

Форма паэзіі Каз. Сваяка даволі markнародная і багатая. Карыстаецца ён рознымі спосабамі вершаваньня і карыстаецца імі зручна і гібка, хоць вершы яго бываюць часта нявыканчаныя і шурпатыя, што адчасьці тлумачыцца ягонай цяжкай і доўгатрывалай хваробай. Аднак спосабы гэныя, у параўнаньні да сянь-

няшніх, усё пераважна старыя, клясычныя. І гэта ўсё ў Сваяка цалком ёсьць рэчай зразумелай. Ён не тварыў згодна з прынцыпам „мастацтва для мастацтва", як гэта часта і пераважна бывае ў перасычаных людзей і грамадзянстваў, а праз мастацкую форму, праз пачуцьцё красы, праводзіў сусім канкрэтныя, філёзофічна-грамадзкія ідэалы.

Шуканьне і апяваньне ў паэзіі сутнасьці жыцьця агулам і сутнасьці беларускага нацыянальнага жыцьця — вось галоўная мэта і галоўныя матывы творства Каз. Сваяка. Усё жыцьцё, што нас акружае і бурліць навокал нас — гэта ў сваяковай паэтыцкай уяве толькі зьверхнія праявы, гэта толькі лупіна, за якою знаходзіцца запраўднае жыцьцё, жыцьцёвая праўда, да якой ён усьцяж імкнецца і аб якой складае свае песьні.

Гэткі прынцыповы склад душы, гэткі аснаўны настрой ліры Сваяка бачым і ў адносінах яго да беларускага народу. Не шліфаваньне беларускай мовы, не выпрабляньне яе ў рожнародных формах вершу, не апяваньне красы беларускай прыроды, ня лірычна-асабістыя ўрэшце песьні займаюць творчую душу Каз. Сваяка, а прадусім беларуская нацыянаньная ідэолёгічная праблема. Ня вонкавыя праявы жыцьця беларускага народу займаюць яго, а сутнасьць гэтага жыцьця.

Гэткае сваё заінтэрасаваньне беларускім жыцьцём Казімер Сваяк праявіў у сваім паэтыцкім творстве на трох галоўных адцінках жыцьця беларускага народу: на рэлігійным, нацыянальным і соцыяльным.

Чужынцы, карыстаючыся для сваіх утылітарных мэтаў хрысьціянствам, увялі глыбокі грозны разьдзел у беларускім народзе. Сваяк бача гэта і моліць Хрыста, каб народ гэты знайшоў сябе самога ў гэтым развале і каб ён „пачуў" душу сваю.

Сьвятар-чужак жалезную
Руку падняў:
Сьвятыню нам належную
Сілком заняў.

Расьселіся, раз'еліся
Нябес купцы,
У пёрыны адзеліся —
Маўляў глушцы.

Народны жаль, народны боль
Ня кране іх:
Вядуць на зьдзек, вядуць на боль
Сьляпых, крывых.

Прыдзі, Хрысьце, нам веру дай —
Моц Божую:
Няхай пачуе родны край
Душу сваю.

(Прыдзі, Хрысьце) *).

*) Казімер Сваяк — „Мая Ліра".

Вызваленьне з гэтай грозьбы народу паэт бача ў агульна-хрысьціянскай і агульна-беларускай сынтэзе.

Хочаш ты знаць, якую веру
Сам прызнаю і песьняй апяваю?
Скажу няшмат, бо знаць тут трэба меру,
Апроч таго ня ўсё кажу, што знаю.

Я веру ў нейкае вяліка' Аб'яднаньне,
Ці як завуць яго з лаціны — Уніонізм
І ў пяруна крывіцкага прызнаньне
І ў хрысьціянскі зноў сьвяты натуралізм.

(Веру нярозуму проціў) *).

Бача ясна так-жа Сваяк і беларускае нацыянальнае паняволеньне і адначасна бача вызваленьне з яго.

Думка аб бяздольнай Беларусі нігдзе не пакідае паэта і выклікае ў сэрцы ягоным дзіўна чулы, дзіўна глыбокі і трывалы агонь любові:

Айчыны мілай зор на сабе чую,
Куды ня пайду з самлелай душою.
Айчыны сьлёзнай праклёны лічу я:
Ратунку кліча — „ратуйце з разбою!“

(Айчыны мілай).

О край мой родны! Куды я ні гляну,
Гдзе лёс мой дзіўны мяне не закіне,
Штоколеч думкай сваей не закрану:
Са мной ты ўсюды у кожнай гадзіне.

(О край мой родны).

Думкай Сваяк вечна там, дзе *„яго плача маці“*, дзе яго *„брат з бяды марнее“*, дзе *„пануюць шчэ чужынцы“*.

У натхненьні паэт бача ўжо народныя натугі дзеля яго волі, бача лепшую, узыходзячую над Беларусяй, зару ейнай будучыны:

Ідзе вось ясная пара,
Праўду сьвеціць нам зара,
Айчына — Маці — Беларусь
Гарой, жыва!

(Гымн роднай зямлі) **).

Найбольш гора дазнаў народ беларускі ў цяжкой сваей гістарычнай падарожы ад суседзяў — усходніх і заходніх. З іхняга-ж боку і надалей найвялікшая небясьпека для нашага народу. Але вось паўстаючы да сьведамага, адроджанага нацыянальнага жыцьця, народ беларускі спраўляецца і з гэтай

*) Казімер Сваяк — „Мая Ліра“.
**) Там-жа.

небясьпекай. Грозныя ворагі Беларусі ў творчай думцы паэта адыходзяць на бок і ўжо перастаюць быць ворагамі:

А во страпянуўся род той груганowы!
Быў здалёку чутны гоман нейкай мовы.
Дзівам зьдзіваваліся няпрошаныя госьці,
Бо з зямлі паўсталі беларускія косьці...

(Ой на Русь ды Белу).

Груган з усходу, а крук з заходу
Дарма там жыру шукае —
Бо зерне спорна, у волю prасторна,
Хутка пад неба ўзрастае.

(Загляне сонца) *).

Прасякнуты-ж праводнай сваей філёзофічна-хрысьціянскай думкай, Сваяк у сваім творстве адроджанага свайго народу ня кідае бяз зносінаў з суседзямі, якіх народ гэты апекі толькішто пазбыўся. Не, ён шукае з імі сужыцьця на асновах брацтва, як роўных з роўнымі і вольных з вольнымі, што, ведама, магчыма толькі пры поўнай самастойнасьці кожнага з гэтых народаў і пры тым кожнага на сваей уласнай тэрыторыі, кожнага на падставах Вышэйшай Справядлівасьці.

І ў гэта Сваяк сьвята вера:

Дасьць Бог калісь будзе люд народу братам,
А Русьняк Маскоўцу да Лехіткі сватам!..

(Ой на Русь ды Белу) **).

Урэшце, ня гледзячы на гэны, так здаецца ад зямлі і яе спраў аддалены, мэтафізычны тон ліры Сваяка, удзяляе ён шмат і прынцыповага месца беларускім соцыяльным справам.

Сваяк, як сын працоўнай Беларусі, мучыцца душой, бачачы багацьце, ад якога часта вее крыўдай людзкой, а ўспакайваецца, выабражаючы сябе селянінам пры працы, які „з плугом ідзе“, прыпамінаючы, што ён „корміць сьвет“:

Як бачу хараство харомаў,
Жудосна мне,
Бо з іх тэй штукі, тых заломаў,
Крывёй пахне...

Адну пацеху ў жыцьці маю,
Адкуль буду,
Калі зямельку урабляю,
З плугом іду.

І хоць мне цяжка і гаротна,
Спакою нет,
Але ў душы ўжо немаркотна —
Я кормлю сьвет.

(Мне сумна) ***).

---

*) Казімер Сваяк — „Мая Ліра“.
**) Там-жа.
***) Там-жа.

Сваяк, пад уплывам, відаць, рэвалюцыі заахвочвае беларусаў да новай працы на ніве социяльнай, але з яўнай іроніяй дадае, што цёмныя людцы нашы так у гэтым кірунку разагналіся, што

Нават добрыя будынкі
Пачалі ўжо руйнаваць —
„Годзе кажуць ўжо спачынку,
Трэба ўсё наноў складаць".
(Гэй будуйце).

Вось-жа Сваяк прад гэткай рэвалюцыяй социяльнай, прад гэткім спосабам шуканьня выхаду з социяльных беларускіх злыбедаў, гэтак прасьцерагае народ свой у тым-жа вершы:

Добра людцы, абы сьмела,
Толькі помніце адно:
Хто будуе ня ўмела,
З працы будзе мець драньнё.

Сваяк радзіць беларусу ў гэтай справе гэтак:

Разваж-жа перш чым зробіш,
Адлічы — рахунак здай —
А чаго не утаропіш —
Разумнейшага спытай.

Здабыць трэба перш зямельку,
Бо краіна - матка ўсім:
Хлябок родзіць і кудзельку
Дзецям родным, ня чужым.

Што у нас зямлі ня стала
То ня дзіва ані цуд —
Чужыня нам панавала,
Дзёрла скуру, як той бруд.

Далей Сваяк у тым-жа самым вершы радзіць, каб беларус прадусім працу сваю аддаў свайму краю, каб асьвячаў свой розум і ведай прымушаў зямлю радзіць, каб таго вучыўся, што трэба, а не якой пусьцячыны і каб пазнаў такім чынам добра сваіх ворагаў:

Каб ня даці ім заесьці
Свайго духа і свой труд
І твой край ня даць абсесьці:
Зробіш гэта — будзе цуд.

Будзеш мець зямелькі доваль,
Школы зробяцца з двароў
І авечкай і каровай
Зможаш панскіх шляхтуноў

Гэй будуйце, мае людзцы,
Жыцьцё новае наўкруг,
Нават сонкі хай прачнуцца —
Хто ня вораг — будзе друг *).

*) Казімер Сваяк — „Мая Ліра".

Гэтак больш менш выглядае духовы воблік Казімера Сваяка ў ягоным жыцьці, у грамадзкай дзейнасьці і ў літаратурным творстве. Гэткім гэны ягоны воблік астаўся і ў апошнія дні жыцьця яго на гэтай зямлі.

Красавік 1926 г. Каз. Сваяк — у сталіцы сухотнікаў, як сам казаў. Да аўтара гэтых радкоў надыходзе адтуль ад беларускага дагараючага паэта сьпярша пісьмо за пісьмом, а пасьля і тэлеграма за тэлеграмай з грозным алярмам аб няўхільнай катастрофе і з гарачай просьбай прыбыць да яго і забраць на бацькаўшчыну, каб „паміж сваіх мог дажыць кароткі свой дзянёк“ і каб над ім „ня было дзярно чужое“. „Мне цяжка тут, бо я сярод чужых, а там, у родных Клюшчанах я напэўна папраўлюся, я там паздаравею“ — казаў мне Сваяк ажыўлены і разрадаваны як дзіця з майго прыезду.

Нажаль грудзі паэта былі ўжо сточаны мікробамі дзваньня і ня было ані магчымасьці вязьці яго ў Клюшчанскія сасоньнікі, ані так-жа ніякай надзеі на выздараўленьне.

У Вільні дагараў паэт у Літоўскай Клініцы. Часта траціў прытомнасьць. У ясных праблесках сьведамасьці маячыў нешта аб Беларусі, аб сваім народзе, аб крыўдзе ягонай, прасіў урэшце апякавацца ягонымі творамі, ягонымі рукапісамі, якія ўдалося выдабыць з пад арышту польскай пракуратуры, бо, казаў — „а можа і будзе з гэтай усей маей пісаніны якая карысьць для народу“?!..

Раніцай 6 траўня 1926 году Казімер Сваяк разстаўся з намі, адышоўшы ў тую краіну, у тое лепшае жыцьцё, дзе царства Праўды, Дабра й Красы, з каторага чэрпаў сваё натхненьне і ў чэсьць каторага складаў свае песьні і шчасьлівай часткай каторага бачыў сваю Айчыну — Беларусь.

З досьледаў аб паходжаньні і аб гэрбе Скарынаў

Чытаючы нядаўна том успамінаў пралата Зыгмунта Галькі-Ледухоўскага пад назовам „*Das Buch von meiner Lebensfahrt*" (Prag, an der Jahrenswende 1934—1935), у якой ёсьць шмат вывадаў генэалёгічных і геральдычных, сусім нечакана наткнуўся я на зацемку аб адносінах беларускага роду Скарынаў з дужа старым родам — *Галька на Ледухове Ледухоўскія.*

Адпаведныя тэксты падам ніжэй у даслоўным тлумачэньні з нямецкага.

Вось-жа у канцы разьдзелу пад назовам *Галька* на бач. 267 знаходзім вестку, якая будзе тут для нас выходным пунктам. Вестка гэна прагаварвае да нас гэтак:

— „Мусяць быць яшчэ ўспомнены — піша аўтар — тыя роды, якія праз увагу на супольны гэрб *Шалява* *) трэба аднесьці да нашага роду і якія дзеля гэтага маюць абаснованыя прэтэнсіі быць залічанымі да патомкаў Галькі. Гэткімі ёсьць роды: (памінаем тут недатычачыя нас роды: Алькевічаў, Якушэўскіх, Кучынскіх, Лебінскіх, Лапатаў, Наўратынскіх, Раманоўскіх, Стрыжаў, Сьвірскіх) Скарынаў (павет Рэчыца 1740 — прытачылі доказ шляхэцтва ў 1825 г.)".

Ясна, гутарка тут аб родзе Скарынаў, які здаўна жыў у Рэчыцкім павеце Меншчыны і які напэўна быў аднэй з галін ня так далёкіх Скарынаў Полацкіх. Бо-ж Рэчыца этнографічна ня менш беларуская, як Полацк.

Цяпер папарадку трэба выясьніць значэньне прозьвішча патрыярхі роду Скарынаў — *Галькі,* а так-жа чужога гукам для нашага вуха назову гэрбу *Шалява.* Выясьненьне гэтых тэрмінаў знаходзім на бач. 264—266 успомненай кніжкі, якія з нязначнымі толькі скарочаньнямі падаём даслоўна:

„Род Ледухоўскіх, ідучы сьледам як сваей традыцыі, так і гісторыі, выводзіць сваё паходжаньне спэцыяльня ад *Галькі, сваяка вялікага рускага князя Уладзімера Вялікага, званага сьвятым, у якога быў ён у вялікім паважаньні з прычыны сваей ваеннай здольнасьці і жыцьцёвай мудрасьці.* Пасьля доўгіх войнаў з царствам бізантыйскім, *Галька* быў высланы каля 971 г.,—дата падпісаньня гістарычнага мірнага дагавору,—на чале мірнага пасольства ў Візанцію, да *цара Івана Зэмісхос'а,* каб пазнаць хры-

*) Мова нямецкая, як ведама, ня знае л цьвёрдага.

сьціянскую рэлігію і яе грэцкі абрад"... Баяры і „паслы былі тады *выбіраныя толькі спасярод нарманска - варажскай шляхты.* Тое, што Галька там бачыў, зрабіла на яго такое ўражаньне, што, здаецца, адразу сам прыняў хрысьціянства, а пасьля, вярнуўшыся ў Кіеў, выказываў *чаруючую красу і дастойнасьць багатых рэлігійных цэрэмоніяў, сьвятасьць хрысьціянскай веры і шчасьце тых, што да яе належылі,* а так-жа дараджаў князю, *разам з яго народам, прыняць сьв. хрост і гэткім чынам прысьпяшыць духовае адраджэньне рускага народу.* Калі-ж некаторыя паганскія баяры пачалі падсьмейвацца з яго новай веры, як з блуду, насьмешліва яго пыталі, ці адважыўся-б ён з гэтай прычыны ўступіць з імі ў барацьбу,—даў ён ім тады гэткі адказ: — *Нават не з адным, а з трыма!* — тады *назначыў навокал сябе на пяску круг, упісаў у яго тры крыжы,* паказваючы гэтак, *што ёсьць ён хрысьціянінам і мае надзею ў Богу і цалком пабіў усіх трох сваіх праціўнікаў.* — Цікавае гэта здарэньне! Бо паводле старога англа-саска-нарманскага звычаю тыя, што між сабой змагаліся, прадтым клалі навокал сябе каменьні, *або азначалі круг.* „Меч урэшце вырашаў спор". „Меч ужо служыў вікінгам за плуг". (Гэтак кажа Нэстар, рускі хронікар, гэтак кажуць так-жа арабскія хронікі Ібн Фосcляна. (Гл. І. В. Weiss IV т., бач. 137нн. — 143, 145, 408 — 412нн. — 475). Далей узноў — і гэта нешта асаблівае! — дапасаваны тут стара-нарманскі прынцып: „Маеш аднаго праціўніка,— заатакуй яго. Проціў двух так-жа мусіш бараніцца. Нават з трыма ня сьмееш стараніцца барацьбы. І толькі ад чатырох праціўнікаў можна табе адступіць. Бо ёсьць рыцарскі загад: атакуй ворага аднаго, бараніся проціў двух, не стараніся трох, адступай толькі прад чатырма" (Cantu т. 9, бач. 60).

„Вось-жа Вялікі Князь *Уладзімер, каторы быў прысутны на гэнай барацьбе, што адбывалася ў імя пераможнага знаку сьв. крыжа, абдарыў Гальку першым хрысьціянскім гэрбам,* каторы яго адрожніваў з паміж усіх дагэтуль яшчэ паганскіх баяраў. Гэрб гэны складаюць: *тры залатыя крыжы — грэцкай формы, дык з шырэйшымі канцамі, — абнятыя залатым абручом і асаджаныя на блакітным фоне.* Аздобай гэрбу служа выступаючая з прылбіцы пазалочанага турнеевага гэлму правая і апанцыраваная жалезам рука з выдабытым і прыгатаваным да адмераньня ўдару старaруска - нарманскім мячом. Гэрб гэты завецца *Шалява,* паводле Папроцкага *Салява, ці Слава — Збаўленьне!*

„Гэтак вось Галька,—званы так-жа Салявіта ці Слаўны— *першы прынёс* рускаму народу хрысьціянскую веру — *Anno Domini 971* (з крыніц: Нэстор... Гл. Paprocki—„Gniazdo cnoty" 1578 бач. 209 і „Herby rycerstwa polskiego" 1584 бач. 550. Długosz — Dzieje Polski). На памятку гэтага факту адна галіна пачала насіць мянюшку *Навротынскіх,* палаціне *Conversor.* (Там-жа).

Што гэрб Галька-Ледухоўскіх і аднача сна нашых Скарынаў паходжаньня нарманскага, вырасшага, відаць, ня толькі з сухіх

досьледаў хронікарска-гэральдычных, але так-жа з доказаў усім рэальных, паслухайма, што аб гэтым гавора аўтар вышэй цытаваных мейсц на бач. 268: „У 1928 г. мой верны і разьбітны таварыш падарожы *Адольф Кольлер* даканаў слаўнага вынаходу ў каралеўскім замку Фрэдэрыксборг пад Копэнгагай, калі мы ў яго ўваходзілі сходамі, сэрпэнтынай віючыміся, каторых сьцены ўсеяны былі сотнямі гэрбаў. Вось-жа там у чатырох іншых, выразна збратаных з маім на адным шчыце гэрбаў, адкрыў ён наш гэрб, аздоблены пры тым вялікім крыжам ордэру Данэборга. Таксама на гэтым гэрбе быў наш радовы кліч: *Avorum respice mores!* (Зважай на абычаі продкаў). Пры помачы пазьнейшых досьледаў, пры пасрэдніцтве чэхаславацкага пасольства пры каралеўскім урадзе ў Копэнгазе, выразна сьцьвердзіў я, што тут (у справе гэрбу ў Фрэдэрыксборгу) іменна ідзе аб аднаго з патомкаў Галькі — *Galki!* *).

На пытаньне, дзе была калыска роду Галька-Ледухоўскіх, і *eo ipso* беларускіх Скарынаў, аўтар успамінаў адказвае (бач. 263—264) гэтак: „*Паходжаньне нашага роду губіцца ў цемры недасьледжаных часаў.* Аднак ня гледзячы на гэта ўсё, можам паказаць на некаторыя, вынікаючыя з гісторыі адзнакі, якія ў наступстве даюць вынікі проста дзіўныя. Так, першыя акружаны легендай і ўжо пацьверджаны гісторыяй продкі нашага роду паходзілі бяз сумніву з паўночных краёў, іменна з сяньняшняй Швэцыі. Мусілі такім чынам яны *быць нарманскага паходжаньня, вараскай крыві.* Больш чым прад тысячай гадоў, як таварышы аружжа Рурыка, маглі яны быць пакліканы са сваей прабацькаўшчыны ў рускую зямлю самымі рускімі, бо былі з нарманскага князёўскага роду. Было гэта, быць можа, ужо ў часе паклíканьня гэтага князёўскага роду, гэта знача ў IX стаг. нашай хрысьціянскай эры... Быў ён, знача, бязсумніву *паходжаньня нарманска-вараскага,* прытым нятолькі, як сваяк вялікага князя з роду Рурыкавічаў — Уладзімера Вялікага, але так-жа быў гэткім на падставе паданых тут абставінаў і звычаяў. Гэральдык Зэрніцкі-Шэліга залічае род *Галькі* да паходзячых ад Рурыка".

Запытаем цяпер: Якія-ж былі адносіны роду Галькі і Скарынаў да Краю? Адказам будзе гэта цытата (бач. 266): „У XIII ст. ваюе *Тодар Галька* — паводле аднэй крыніцы кіеўскі ваявода — проціў... нямецкага ордэну. Каля 1300 году гэтман рускі *Пётр Галька* **) вядзе вайну з Польшчай, маючы Літву і Татараў, як

*) Аб тым, што рускія гэрбы не знаходзяцца пад уплывам польскай сфрагістыкі, а насьлядоўваюць сфрагістыку Балтыцкага пабярэжжа, або Даніі, гавора так-жа ведамы ўкраінскі гэральдык др. Іван Шпытковській у сваей працы „Рід і герб Шептицьких" („Богословія", Львоў 1934. Т. XII, кн. I), гдзе апіраецца на Міхайлу Грушэўскім, Б. Барвінскім і Сэмковічу.

**) Знае гэтага рускага гэтмана з пачатку XIV в. Міхайла Грушевськiй (Історія III, вид. 2, ст. 112, нот. 1).

таварышаў аружжа... У XV стаг. узноў рускія гэтманы: *Глеб і Януш Галька знаходзяцца ў войску Уладыслава Ягеллы.* Ваююць яны з нямецкім ордэнам. Пад Грунвальдам у 1410 годзе... (Гл. Briger Johannes „Chronik". — Bielski „Kronika Polska" 1576 t. 13, бач. 8. — Niesiecki „Encyklopedja". — „Herbarz Polski" t. 4 б. 250. — Okolski t. 3 бач. 83, t. 8 бач. 87). А што датыча *роду Галька,* дык параўнай трудна сяньня даступныя матар'ялы ў „бібліотэцы прыватнай" Здзікоўскага. — Далей матар'ялы ў б. „Царскай Публічнай Бібліотэцы". — У „VI радаслоўнай кнізе Валынскай губэрні". — Урэшце архіў Кіеўскай Лаўры. — Архівы грэцкага патрыархату ў Стамбуле".

Аўтар успамінаў пралат Зыгмунт Галька-Ледухоўскі прад і па вайне адведаў Вільню, гдзе жыў яго далёкі сваяк, слаўны скрыпач Ігнат граф Галька-Ледахоўскі († 1927), жанаты з таленавітай скрыпачкай Вандай Багушэвічанкай, братаніцай нашага Фр. Багушэвіча. Пралат З. Галька-Ледухоўскі жыве ў Чэхаславацыі (Прага. Podbaba. Dolni Šarka 80).

Цікавую кніжку здобіць генэалёгічнае дрэва (нажаль у дужа малым маштабе) і некалькі рэпродукцыяў гэрбу роду Галькі, а знача і гэнага Скарыны з Рэчыцкага павету.

Адна рэпродукцыя рэпрэзэнтатыўная, урачыстая, парадная; другая й трэцяя скап'яваныя з гэнэалёгічнага дрэва. Для нас найцікавейшы гэрбавы шчыт, а менш ужо многія яго дэкорацыі ў стылі і смаку даўнейшых часаў. Разьмяшчэньне зорак на шчыце ў трэцяй рэпродукцыі прыпамінае нам сонечны шчыт на гэрбе Скарыны з упісаным на ім падабенствам твары. Хоць людзі ў сярэднявеччы часта малявалі сонца ці месяц з гэткім на ім падабенствам людзкага твару, то аднак мог ён на гэрбе Скарыны астацца як фігура паходная, дзякуючы сумыснай ці прыпадковай камбінацыі трох зорак (двое вачэй і вусны).

Калі йдзе аб Скарыну, нельга нам нічога памінуць, што мае хоць найменшую сувязь з асобай перакладчыка Бібліі на беларускую мову.

А. БУЖАНСКІ

Недахопы „айцоў"

(аб направе нацыянальнай мэнтальнасьці)

Цусіма, грымоты першай расейскай рэвалюцыі, сталыпінская рэакцыя і зацішша, перагружанае электрычнасьцю, перад насьпяваючай пераможнай рэвалюцыйнай хваляй 1917 году — гэта агульнарасейскі фон, на якім разьвівалася „нашаніўская пара", гэта фон беларускага Risorgimento.

Народ пазбаўлены традыцыі, аддаены на ласку расейскага прыстава і земскага начальніка, суседзтва ўсемагутнага польскага памешчыка, безнадзейная пустата і цемната навокала, „казённая вінная лавка" і час ад часу праваслаўныя „крестныя ходы" і каталіцкія працэсіі — гэта фон беларускі.

Паўстае масавы нацыянальны рух, паўстае прэса, літаратура, выгартаюцца з архіваў гістарычныя забыткі, з абломкаў прысвоеных чужынцамі рэстаўруецца гісторыя.

Беларускі народны рух захапляе, галоўным чынам, сялянскія і работніцкія гушчы, пазбаўленыя сваёй традыцыі, але не прасякнутыя чужой, што датычыла і датычыць інтэлігенцыі зрусіфікаванай, альбо спольшчанай, узгадаванай на польска-расейскай грызьні.

Польска-расейская калатня на Беларусі заразіла кроў зрэнэгаванай беларускай інтэлігенцыі, польскія паўстаньні і мураўёўскія падаўленьні засугэравалі яе і перашкодзілі ёй далучыцца да беларускага адраджэнскага руху.

Памінаючы дынаміку адраджэньня і дасягненьні, зробленыя піонерамі-нашаніўцамі, выступае адна рыса тэй монумэнтальнай эпохі, на каторую дагэтуль зварочана вельмі мала ўвагі.

Беларускае адраджэньне ўвайшло на форум жыцьця неяк бокам. Увайшло яно неяк надта скромна і, калі гэтак можна выразіцца, чорным ходам.

Кожнае новае зьявішча, ці гэта ў галіне палітыкі, мастацтва ці літаратуры, павінна выклікаць адпаведны рэзонанс, тымболей малады нацыянальны рух; беларускі рух у нашаніўскую пару рэзонансу ня выклікаў.

Піонеры Адраджэньня, зрабіўшы аграмадную работу, навонкі справу не запрэзэнтавалі і не патрапілі надаць ёй эўропэйскага разгалосу. Трэба сьцьвердзіць, што толькі дзякуючы сялянска-работніцкай Грамадзе, калі слова „гурток" зьявілася на шпальтах „Times'у", „Le Matin'у" і „New-Iork Herald'у", сьвет даведаўся аб беларусах.

Лейтмотывам нашаніўскае эпохі была просьба:—дазвольце, паночкі, сярмяжнаму беларусу ў сваей уласнай хаце ў куточку пераначаваць!

У рэзультаце „скромнасьці“ і нейкай палахлівай мэнтальнасьці піонераў, адраджэньне 12 міліённага народу прайшло незаўважаным, тады, як прыкладам, вызвольны рух македонцаў, народу малога, знайшоў водклік у цэлым сьвеце.

Найгоршым было тое, што нашаніўцы не навучылі беларуса расьпірацца лакцямі, на нацыянальную рахманасьць — найбольш ад'емны бок беларускага характару — не зьвярнулі ніякай увагі.

Вось жа нам ідзе аб направу народнае псыхікі, а што гэткая направа магчыма, маем шмат прыкладаў у гісторыі. Ня маем сьмеласьці рабіць закіды першым адраджэнцам, — памяць іх кожны беларус заўсёды ушануе ўставаньнем. Але тое, што нашаніўская пара нічога не дала ў сэнсе направы псыхікі і што ў сіле астаецца сказ з расейскага падручніка географіі: — „беларус па сваей прыродзе вельмі спакойны і надта добры землякоп“ — гэта фатальна адбілася на далейшым разьвіцьці падзеяў і да сяньня цяжэе над крывіцкім народам. Беларускае Risorgimento заскромна з апушчанай галавой увайшло ў гісторыю!

Гэта пролёг.

* * *

1935 год. Польскія палітыкі беларускую справу зьнялі цалком з афішы.

У палітычных нэгоцыяцыях беларусы ў рахунак не бяруцца.

Пэўныя сваёй бяскарнасьці з цёмных куткоў вылазяць розныя Шантыры, плюючыся сьліною ненавісьці.

Скуль-жа-ж розныя Шантыры чэрпаюць эрудыцыю ў беларускіх справах,—з акружэньня, з беларускага асяродзьдзя? — Не, яго яны не вывучаюць, а проста ня зносяць à priori. Эрудыцыю яны бяруць з літаратуры, каторая для іх дыспозыцыі адумыслова створана. У польскай мове ёсьць дзьве кнігі, якія зьяўляюцца для найшырэйшых слаёй грамадзянства вехамі ў лабірынце беларускіх спраў.

Маем на думцы повесьць Загорскай „Trucizny“ (Anna Zahorska-Savitri) і кнігу Лявона Васілеўскага „Litwa i Białoruś“. Факт вельмі характэрыстычны, што гэныя „Trucizny“, выйшаўшыя з друку ўжо даўно, чамусьці ня выклікалі абурэньня беларусаў. Мала таго, з гэтым „творам“ беларуская прэса не пазнаёміла шырака народныя масы. Былі маленькія рэцэнзіі і на гэтым канец. А гэны „твор“ з вельмі удалым назовам „Trucizny“ (Атруты), прайшоўшы ў бібліотэкі і ў чытаючы польскі агул, расьсейваў атруты шовінізму і ненавісьці да ўсяго беларускага, прадстаўляў беларускі народ у агідным асьвятленьні і быў пляўком у твар беларускага народу ў нашым краі.

У адношаньні да беларусаў — гэта кніга ёсьць такім-жа пагромным эвангельлем, як у адношаньні да жыдоў „Пратаколы сіонскіх мудрацоў“. І маўчаньне беларусаў у гэтай справе ці ня ёсьць вынікам „скромнага“ сьветапагляду пачынальнікаў Адраджэньня?

Дзеля таго, што творам пані Загорскай у беларускім друку мала хто займаўся, пазволім сабе зацытаваць пэўныя месцы: (гаворыцца аб беларускім спэктаклю ў пагранічным мястэчку па наш бок мяжы)—

„На афішы значылася, што будзе адыграна п'еса „Разарённае (?!) Гняздо“. Увайшлі ў вялікую салю прыбраную бяз густу і стылю. Сядзелі тамака мужыкі ў сярмягах, паўінтэлігенты. Аніводнае постаці, ад якой-бы веяла поўнай культурай з выражэньня твару і з вонкавага выгляду. Пры ўходзе стаяла група. Вуграваты тып з белай чупрынай нападаў на „кепства польскіх уладаў“, якія не дазвалялі адчыніць беларускую школу, бо прадстаўлены вучыцель гаварыў толькі парасейску. Паўстала пытаньне, у чым будзе беларускасьць гэтай школы? — Ня маем інтэлігенцыі — уздыхалі“. Таму гэтая цёмная маса без гістарычнае волі чапляецца хоць-бы і да мяне — падумаў Васілевіч з нясмакам і пачуў адразу жаль. Так, яны ўбогія духам. Таму трэба да іх ісьці. Паднялася занавеса. Па ўдэкараванай сцэне рушаліся акторы без таленту. Усё перанятае з расейскага рэалістычнага тэатру, да таго-ж з провінцыі, з нейкага Арла ці з Харкава, — фармулаваў Васілевіч. Гралі на расейскі лад, а гаварылі пабеларуску. Выглядала гэта на нейкую карыкатуру, як гумарыстычная ўкраінская пародыя аб стварэньні Эвы з сабачага хваста, або „Тарас на Парнасе“.

На сцэне разыгрывалася драма. Сярод беларускай шэрасьці шалеў падпальшчык (скопіяваны з Андрэева). З патосам кідаў словы ненавісьці на паноў. Клясовасьць, як белыя ніткі, вылазіла з усіх швоў гэтага насьпех фабрыкаванага нацыяналізму...

Адсувалі крэслы, пачыналіся скокі. Гармонія заенчала нацыянальную лявоніху. Панна ў чырвонай блюзцы з каровім какецтвам апёрлася на дзяцюка ў чорнай сарочцы. Румяная беларуска прыпомніла Васілевічу панну Антаніну. Хвараблівa засумаваў ён за ёй, ці за кокаінай?“

Якой „субтэльнасьцю“ выражэньняў і „блескамі“ інтэлекту вее ад гэтага адрыўку аўторкі-эстэткі! Прывядзём яшчэ адзін адрывак з гэтага эпохатворчага раману:

„Хочаце ўвайсьці да нас? запрашаў сваімі сьвятлістымі вачамі Осьвяцкі (якое сымболічнае прозьвішча! А. Б.). Яны стаялі перад домам у польскім стылю. — Гэта знача куды? У сялібу польскай Мацежы школьнай. Увай-

шлі ў прытульную салю прыбраную партрэтам „wieszczów“. На паліцах стаялі „porządnie” апраўленыя кніжкі, азначаныя нумаркамі. Паненка ў гарцэрскай вопратцы ветліва і стройна спаўняла функцыі бібліотэкаркі. — Бачыце гэтага госьця — паказаў Осьвяцкі на інтэлігента з рыжаватай бародкай, — гэта расеец. Няма тут ніякай іншай саліднай бібліотэкі. Ад часу, як трымаем кнігі, інформуючы аб навейшых выніках культуры ў Эуропе, ён прыйшоў да нас. Шукае культуры наагул, пакуль што старонючыся ад польскай. Прыдзе час і на гэта...

Прыйшлі ў чытальню, дзе шмат людзей сядзела пры газэтах і ілюстрацыях. Осьвяцкі адчыніў наступныя дзьверы.— Уваходзьце хутчэй. Лучылі ў цёмнасьць. Дзьверы зачыніліся за імі. Крыху пазьней Васілевіч асвоіўся з акружэньнем і сконцэнтраваў увагу на экране, на каторым значыўся нейкі чыкагскі небаскроб. Лектар проста і пэдагогічна гаварыў на тэму: „Амэрыка край багацтва“. У паветры чуць было карбітам — І тут таксама, ...загучаць магутныя прамысловыя заводы. Запульсуюць паровыя молаты. Жыцьцё возьме шалёны радасны разгон, — кончыў лектар. Ізноў асьвятлілі салю. Было тут многа дзяцей школьных, чыстых і вымытых, якія спакойна і дысцыплінавана пачалі апушчаць салю, уступаючы ў праходзе старшым.— Скуль узяліся гэтыя дзеці? дзівіўся Васілевіч, цалком вымытыя. Гэткіх на „Kresach“ дагэтуль ня было! — Беларускія дзеці — усьмяхнуўся Осьвяцкі, такія сабе дзеці з местачковага няхлюйства нават і праваслаўныя. Чаго-ж вы хочаце, нядарма існуе нашая „повшэхная“ школа. Шэсьць год б'ём галавой у мур, але й у муры дзіру можна зрабіць. А цяпер пакажу вам ілюстрацыю да лекцыі. Завёў яго на чыста ўтрыманы сквэрык. Пасярэдзіне на горцы стаяла альтанка. Васілевіч прыпомніў сабе, што тут у сьвята часам грала аркестра. — Перад вайною тут нічога ня было — гаварыў Осьвяцкі, цяпер глядзеце: тутака новая чыгуначная станцыя, тут школа, там — направа — тартак, побач завод імпрэгнаваных шпалаў. Тыя шырокія дахі за вёскай — гэта фабрыка гнутых мэбляў“.

У параўнаньні з папярэднім абразом беларускага барбарызму такой мілай і будуючай атмосфэрай вее з вышэйпададзенага фрагмэнту, што неяк проста непрызваітымі выдаюцца думкі аб недахопах у навуцы беларускіх дзяцей, прайшоўшых праз польскія школы і іншыя культурныя пляцоўкі, створаныя і кіраваныя п.п. Осьвяцкімі.

Калі прыглядзімся да розных трікаў „шаноўнай пані Savitri“ дзеля задэмонстраваньня вышэйшай місыі вышэйшага народу, прыходзяць на думку лекцыі п. Carlo, каторы нядаўна аб'яжджаў гарады Польшчы з мэтаю популярызацыі італьянскае місіі ў Абісыніі. Дык вось гэты прэлегент пасьля сваіх адчытаў раздаваў

альбумы затытулаваныя панямецку: „Was Genf nicht sehen will“ (Чаго Жэнэва ня хоча відзець). На аднэй старонцы альбуму пахілая ўбогая хацінка — гэта коптыйская царква ў „Аддіс-Абэбе, побач багацейшы храм у найлепшым стылю — гэта таксама коптыйская царква, але ўжо ў Асмары (Італіянская Эрытрэя). Далей, гара трупаў гніючых, зьверска пакалечаных абісынскімі бандытамі (відочна на тэрыторыі пад уладай нейкага абісынскага раса). Побач элегантныя сёстры і лекары італіянскага чырвонага крыжа перавязваюць і лечаць абісынскіх дзяцей. З аднаго боку зьдзічэньне і занядад, з другога культура, поступ, сьвятло. Што да гэтага альбому, выданага італіянскім Ministerio della Stampa e Propaganda, дык наіўнае і мала пераконваючае разьмяшчэньне ілюстрацыяў мала каго засугэруе, а што датычыць кніжкі п. Загорскай, дык тасаваньне падобных спосабаў у адношаньні да народу даўшага бацькаўшчыне шаноўнай пісьменьніцы Міцкевіча, Касьцюшку, Матэйку і інш., выклікае думку аб агіднай духовай арганізацыі пэўных экзэмпляраў роду чалавечага.

Цяпер некалькі слоў аб фабуле раману.

Збанкрутаванага абшарніка Васілевіча, кокаіністага і п'яніцу цёмныя сілы абкружаюць, стараючыся ўцягнуць у Грамаду. Найбольш у гэтым кірунку працуе панна Антаніна, каханка Васілевіча. Васілевіч мае сымпатыі да беларускай справы, ён беларус з паходжаньня, але ягоная арыстократычная душа баіцца соцыяльнага радыкалізму беларусаў.

Грамадаўцы, з якімі ён спатыкаецца, паслы Грыб і Смарчок, абяцаюць яму на ўласнасьць маёнтак Васілева, адзіны, каторы астаўся на гэтым баку граніцы; абяцаюць на выпадак захвату улады грамадаўцамі. Гэта яго абурае. Пад уплывам панны Антаніны, ён кідае жонку, з каторай у яго непаразуменьні нацыянальнага характару, прычым ён маніцца перайсьці на праваслаўе. Але ў Васілевіча падвойная душа: адна польская, а другая беларуская. Ён прыглядаецца да дзейнасьці гурткоў Грамады і гэта яго адцягвае ад беларускай справы. Ён жыве то ў Варшаве, то ў нейкім беларускім мястэчку. Аднойчы ён выбіраецца ў свой маёнтак Васілева, каторы знаходзіцца над самай граніцай. Тамака скамунізаваныя сяляне, пазнаўшы ў ім гаспадара ўласнасьці, з каторай яны тымчасам карысталі, пры помачы заграінчных камуністаў хочуць забіць Васілевіча. Прыпадкова ён ратуецца, варочаецца ў Варшаву, дзе жонка ягоная ўмяшчае яго ў санаторыю. Падзеі над граніцай вылячылі яго з беларускасьці, а санаторыя ад п'янства і кокаіны. Ён асядае ў сваім маёнтку з жонкай і дачкой, астаючыся верным сынам польскага народу.

Трудна і непатрэбна адтвараць зьмест кнігі. Важна тое, што ўсе беларусы, паводле аўтаркі, — гэта грамадаўцы камуністы. Іншых яна ня ведае. Іншыя нарушылі-б конструкцыю ейнае кніжыцы. А наагул аўтарка „добра“ азнаёмленая з беларускай гісторыяй і літаратурай. Аб літаратуры яна, вуснамі сваіх пэрсонажаў,

заяўляе: уся беларуская літаратура можа зьмясьціцца на аднэй паліцы; што да гісторыі, дык беларусы толькі два разы сябе выявілі — забіваючы Язафата Кунцэвіча і разьбіваючы двары падчас бальшавікоў. Коратка і ясна. Ад гэткіх „мудрасьцяў“ у кніжыцы аж роіцца. Delirium tremens галоўнага героя раману перайшло на асобу аўтаркі-эстэткі. Што п. Загорская эстэтка з вельмі субтэльным пачуцьцём не падлягае ніякаму сумніву; яна шалее за Грігам, найбольш ёй падабаецца песьня Сольвэйгі з Пэр Гінта. Толькі неяк дзіўна пераплятаецца ў гэтай эстэткі песьня Сольвэйгі з гэткімі краскамі, як: „szerokomordy i wyłupiastooki okaz rasy białoruskiej“ (бач. 92).

Але трэба скончыць з Загорскай Savitri і з яе „Truciznami“. Выйшай з друку гэны „шэдэвр“ даволі даўно, яшчэ ў 1931 годзе. Крытыкай займацца ўжо неактуальна. Мы закранулі гэта толькі ў сувязі з агульнай тэмай. Не адрэчы тут яшчэ адцеміць, што ў чэрвені месяцы бягучага году апэляцыйны суд у Львове сканфіскаваў повесьць Гоголя „Тарас Бульба, як абражаючую годнасьць польскага народу („Expres Poranny“, № 154, 4-VI-1936 г.). Ці не магла-б, прыкладам, віленская пракуратура на „Trucizny“, цкуючыя на 3 мілёны беларусаў у Польшчы, знайсьці адпаведны параграф?

Гаворачы аб „Litwa i Białoruś“ Лявона Васілеўскага, трэба засьцерагчыся, што гэтая кніга зусім іншага характару. Гэта нарыс гісторычна-палітычны нацыянальных адносін, утрыманы ў тоне корэктным і прызваітым. Разглядаючы старадаўны пэрыяд беларускай гісторыі, аўтар адзначаецца, нават, нікаторым об'ектывізмам. Аўтар паклікаецца на нікаторыя жаролы — відны ў ім натугі да сумленнага выкананьня працы, апрача таго ён адумысловец у справах нацыянальных меншасьцяў у Польшчы. Але вось закранаючы Ф. Багушэвіча, п. Васілеўскі робіць памылку, уласьцівую амаль усім польскім літаратарам і крытыкам. Паводле ягонае думкі, Багушэвіч зьяўляецца прадстаўніком нацыянальнай беларускай літаратуры (перад гэтым п. В. абгаварвае літаратуру польска-беларускую), будучы сам паляком і культурна і нацыянальна.

Тут ёсьць пэўная непрадуманасьць.

Калі ў адносінах да літаратуры польска-беларускай (Ян Баршчэўскі) п. Васілеўскі кваліфікуе тварцоў яе, як палякоў, дык у гэтым з ім можна згадзіцца, але называючы Багушэвіча паляком нацыянальна і адначасна „зьвястуном“ новага этапу разьвіцьця беларускага пісьменства — літаратуры нацыянальна-беларускай, — папаўняе лёгічную памылку.

Далей, у разьдзеле аб нямецкай окупацыі, гаворачы аб зносінах „Гоману“ з Ober-Ost'ам, п. Васілеўскі прыгадуе розных расейскіх „палітыкаў“, наракаўшых на „заплёмбаваны вагон“ Леніна.

Разглядаць кнігу Лявона Васілеўскага „Litwa i Białoruś“

не ўваходзіць у нашае заданьне і зусім неактуальна. Ідзе толькі аб тое, што яна таксама дае скрыўлены перакрой беларускага культурна-палітычнага жыцьця. І ідзе яшчэ аб тое, што яна, таксама як і „Trucizny“, ляжыць у найбліжэйшым засягу розных Шантыраў і п. Cat'аў з віленскага „Слова“ і іншых „прыяцеляў“ беларускага народу.

Разглядаючы выданьні, каторыя прычыніліся да пашырэньня і, калі гэтак можна выразіцца, да ўстабілізаваньня зьвягі на беларусаў і беларускую справу, прыходзіць на думку, што ня толькі чужыя шовінізмы адыгрываюць тутака галоўную ролю.

Нейкае толстойскае непраціўленьне сілай злу, нейкі пасыўны усходні дух рабіндранаттагорызму лунаў над нашым адраджэньнем. Вельмі сымптоматычна, што ў найцікавейшага пісьменьніка нашаніўца Гарэцкага, у найлепшай повесьці „Антон“, як тоно знаходзім словы з Талстога.

Дзеля таго, што ў адраджэнскай літаратуры былі толькі „пэйзанскія“ настроі (не мотывы: мотывы іншыя не маглі быць), без фэерычных бліскаў, — дык адсутнасьць эфэктаў таксама стварыла ў суседзяў малое зацікаўленьне справай, якая ў недалёкай будучыні змусіць іх да крыху лепшага трактаваньня...

Думаем, што калі-б беларускае Адраджэньне паказалася з „гулкім гоманам грымотаў“, як многа пазьней камандаваў арлянятам Купала, дык напэўна гэткага роду літаратура не знайшла-б сабе выдаўцоў.

Тэза, што беларус „таксама“ хоча жыць на сваёй зямельцы, была вынікам малой кінэтычнасьці беларускага руху (пры вялікай дынамічнасьці). А гэтае апошняе ці ня ёсьць вынікам адсутнасьці гісторыёзофіі? Ці ня ёсьць найвялікшым злом, што вялікі народ з вялікай гісторыяй ня мае апрацаванай гісторыёзофічнай думкі? Ці ня гэта стварае спрыяючы грунт для дзейнасьці Cat'аў, Шантыраў і для пашырэньня „Truciznaй“?

Міхась Машара — „Лёгкі Хлеб“. Драма ў трох актах з жыцьця вясковай моладзі.

Выд. „Беларускай Крыніцы“. Вільня, 1936 г. бач. 63, 20 × 13.

Міхась Машара, як бачым, піша нятолькі вершам, але так-жа й прозай. Вось прад намі гэтак напісана, выдана яшчэ сёлета летам, драма „Лёгкі Хлеб“. Першы акт і другі адбываецца на сяле і адначасна, а трэці ў Вільні гады два пазьней.

Фабула драмы гэткая. Вясковая дзяўчына, дачка багатага селяніна, атрымала сякую-такую асьвету і адбілася ад роднага асяродка. Яна ўжо чураецца сваіх таварышаў вясковых хлапцоў, заглядаецца на нейкага валацугу, дарожнага майстра, быўшага афіцэра Крукоўскага і ўрэшце аддае яму сваё сэрца. Чаму так? Дзе прычына такой драматычна-фальшывай псыхікі вясковай дзяўчыны? У цемнаце агулам і ў нацыянальнай нясьведамасьці. Вера атрымала пачаткі асьветы, як відаць з яе любасьці да русыцызмаў, у чужой расейскай школе. Школа гэта, замест аткрыць ей вочы на праўду, яшчэ больш яе зацямняла й вучыла пагарджаць усім родным, беларускім: пагарджаць сваей мовай, працай, усім вясковым бытам. Вось-жа Вера добра і вялікую мерку прысвоіла сабе гэтага фальшу й лятуцела аб нечым лепшым, „цілігентным“, аб нейкім страйнейшым і лягчэйшым жыцьці, аб „лёгкім хлебе“, агулам гаворачы.

Крукоўскі, па празваньню сялян Крук, нейкі здэмаралізаваны прыблуда балаховец, гэты трагічна-фальшывы настрой вясковай дзяўчыны спрытна выкарыствае. Ён, зайграўшы роль „цілігента“, аб якім Вера ружова лятуцела, прыкінуўся ўлюбленым, — лёгка здабыў яе сэрца і... пасаг. Лявон Мутэрка, бацька Веры, разумны селянін, усю гэту трагічную хлусьню прынамсі часткова разумеў і на жанімства Веры з Крукоўскім рашуча быў праціўны. Вера з Круком рашылі ўцякаць у горад і там ажаніцца. Спрыяючы дачцэ і шкадуючы яе маці Альжбета благаслаўляе іх на гэта і тайком ад мужа дае ім значную суму грошаў.

Мэта дасягнута. Крук аб жанімстве й ня думае. Яму былі патрэбныя грошы. Ён іх здабыў, а Веру кінуў. Шмат ей прышлося цярпець, галадаваць. Здабывае ўрэшце працу ў сталоўцы. І толькі цяпер, пад уплывам цярпеньняў маральных і фізычных, а так-жа дзякуючы добрым і сьветлым людзям, добрая і разумная ад прыроды Вера перараджаецца духова. Яна пачынае разумець галоўную прычыну сваей трагэдыі і трагэдыю ўсяго свайго беларускага

народу. У тэй сталоўцы, прыехаўшы з вёскі, прыпадкам спатыкаецца з Верай Пятрусь, вясковы хлапец, каторы шчыра яе любіў, аб чым Вера ведала, але для Крука якога адкінула. Усьміхаецца ім шчасьце, але дарэмна... Вера аддаецца службе ідэі адраджэньня беларускага працоўнага народу. Здабывае яна ўрэшце працу вучыцелькі ў беларускай школе.

Ужо з гэтай — дужа агульна пераказанай — фабулы драмы можна мець паняцьце й аб мастацкай яе старане адносна галоўнай тут асобы Веры, якая сапраўды аўтару ўдалася. Прадстаўлена гэта асоба ў драме проста, ясна, у значнай меры тыпічна, агулам праўдзіва і з тэй паэтыцкай прыкрасай у разьвязцы яе асабістай трагэдыі, якая яе характар увыпукляе, заканчвае і надае ей нешта з вечнай красы мастацкай і маральнай. Адно толькі можна-бы закінуць тут аўтару — гэта памойму псыхолёгічную нязгоднасьць з праўдай у тым пункце характару Веры, дзе яна, спаткаўшы Пятруся, замест пагадз'іць, згарманізаваць шчасьце асабістае з грамадзкім ідэалам, уся аддаецца гэтаму апошняму, захаваўшы, праўда, таварыскую з ім дружбу на тым-жа ідэовым беларускім грунце. Вось-жа, факт, што ня выйшла Вера замуж за Пятруся, памойму, ёсьць зьявай псыхолёгічна непраўдзівай. Больш нешта падобнае было-б нармальным у мужчыны, але не ў жанчыны. — Увесь іншы пэрсонаж у драме, за малымі выняткамі, ёсьць добрай „дэкарацыяй“, фонам, дапаўненьнем і завяршэньнем характару й дзейнасьці Веры.

Васіль Лаўручонак, сьлёсар, чалавек разьвіты, сьведамы нацыянальна й клясава, паходзіць з тэй-жа вёскі, жэніцца з аднасяльчанкай Ганулькай, дзяўчынай разумнай і добрай. Гэта пара дужа дабраная. Жыцьцё іх спакойнае і нармальнае, — яно ёсьць кантрастам трагэдыі Веры, яно кідае цёплае сьвятло на яе цяжкае жыцьцё і яшчэ больш аткрывае нагасьць і жудасьць яго.

Рыгор — бацька Лаўручонка і Мар'яна — матка Ганулькі — прадстаўнікі нядаўнай беларускай мінуўшчыны, якія ўжо адыходзяць і якія зьяўляюцца ўжо бадай апошнімі колцамі між нашай мінуўшчынай і сучаснасьцяй.

Лявон Мутэрка — бацька Веры і Язэп Гарачка — гаспадар, у якога кватаруе Крук, першы сваей працавітасьцяй, паглядам на жыцьцё і сваім „чуцьцём“ сутнасьці жыцьцёвай праўды, асабліва адносна справы жанімства сваей дачкі, а другі сваей умеласьцяй падтрымаць добрыя суседзкія адносіны беларускай сялянскай „дыплёмацыяй“, спаўняюць роль свата ад імя Крука — гэта сапраўды мастацкія й праўдзівыя тыпы, якія выдатна дапамагаюць нам зразумець усе тыя абставіны, у якіх расла Вера, а разам з імі і яе жыцьцёвую драму.

Добра так-жа выйшаў у аўтара тып маці Веры Альжбеты. Гэта тыповая добрая маці, любоў якой засланяе розум і звычайнае пачуцьцё рэальнасьці. Хораша і балюча гэта выходзіць, калі яна, выправіўшы ў сьвет Веру, молячыся разважае, што яна зрабіла, што йнакш зрабіць не магла й што жджэ дачку яе?!

Прайдоха Крук змаляваны ў аўтара бадай замала, няпоўна. Мала відаць, чым ён цягнуў да сябе Веру.

Ня сусім праўдзіва прадстаўлены й Пятрусь. Ён распраўляе аб жыцьцёвым матар'ялізме й ідэалізме. Праўда, ён граматны, чытае кніжкі, цікавіцца жыцьцём, з натуры разьвіты, але ўсё-ж астаецца вяскоўцам і, хоць можа быць разумнейшы і не ад аднаго інтэлігента, то ўсё-ж такі ў яго вуснах словы, напр. аб матар'ялізме, — ёсьць зьявай жыцьцёва непраўдзівай.

Агулам уся п'еса напісана жыва, добрай сочнай дзісьненскай мовай, зручна і лёгка зложана ў сэнсе сцэнічным і авеяна яснай думкай: — не адрывайся ад родных карэньняў, не ганіся за „лёгкім хлебам"!

Даводзілася чуць закід, што іменна ў гэтым ідэовым матыве і загана гэтай драмы, а гэта таму, што матыў гэты даўно ўсім ведамы, абкляпаны і ўжо нічога новага не гавора. — Вось-жа я асабіста гляджу на гэта йнакш, галоўны фабулярны матыў гэны ўважаючы ў нашай літаратуры за рэч дадатную й пажаданую: раз, што *„nil novi sub sole"* — нічога новага пад сонцам, як сказаў старадаўны філёзаф, а другі раз, што ў беларускім жыцьці, а знача й у нашай літаратуры, гэткі матыў павінен яшчэ паўтарацца доўга й часта.

Праўда, п'еса гэта здаецца ня будзе лёгкай для пастаноўкі на сялянскай аматарскай сцэне, бо на гэта яна повелікая і запаважная зьместам, але гэта, ведама, не зьмяншае яе вартасьці.

Словам, „Лёгкі Хлеб" Машары — гэта сусім паважны ўклад у беларускую драматычную літаратуру, як з боку мастацкага, так і ідэовага. Астаецца толькі пажадаць, каб аўтар належна цаніў і драматычны жанр свайго літаратурнага творства.

Ад. Станкевіч.

ХРОНІКА

═ Таварыства Беларускай Школы ў Вільні сёлета сьвяткуе 15-годзьдзе свайго існаваньня. ТБШ у сваім часе было самай магутнай і распашыранай беларускай культурна-асьветнай арганізацыяй у зах.-беларускіх землях. Да 1926 г. мела назоў Цэнтральнай Школьнай Рады, ад гэтага году— ТБШ. ТБШ у змаганьні за асьвету сярод шырокіх гушчаў беларускага народу зарганізавала 11 Акружных Управаў (Баранавічы, Беласток, Вялейка, Горадня, Глыбокае, Ліда, Наваградак, Мір, Косаў, Слонім, Сьвіслач), каля 500 гурткоў (1929 год), болей 250 бібліятэк-чыталень і болей сотні народных дамоў. За ўвесь час існаваньня Т-ва толькі Галоўная Управа Т-ва зарэгістравала 10.179 сяброў. Пасьля прыняцьця Соймам у 1924 годзе г. званых языковых законаў. Т-ва змагалася за ўрадовую беларускую школу. На працягу да 1929/30 школьнага году было складзена некалькі дзесяткаў тысяч школьных дэклярацыяў на больш 412 камплектаў школ, у выніку чаго школьныя ўлады адчынілі толькі каля 65 урадавых „беларускіх" і г. зв. утраквістычных школ, якія аднак з часам у большасьці перасталі існаваць, боператвораны ў школы польскія. — У 1928 годзе пачынаецца дзяржаўна-адміністрацыйнымі ўладамі масавая ліквідацыя Т-ва. Сяньня Т-ва налічае ўсяго некалькі гурткоў.

Міма вонкавых перашкод, Т-ва ўсьцяж працуе, і зараз у Галоўную Управу Т-ва з многіх месц паступаюць заявы аб адчыненьні новых і „завешаных" гурткоў.

ТБШ супольна з Беларускім Інстытутам Гаспадаркі і Культуры сёлета 28 лютага прыступілі да правядзеньня акцыі дамаганьня беларускае школы. Дзеля гэтага ўтварылі Школьны Сакратарыят (Вільня, Каралеўская 3—8).

З увагі на прыпадаючы сёлета юбілей 10-годзьдзя існаваньня другой, масавай і заслужанай для беларускага культурнага адраджэньня і вызваленьня, арганізацыі — Беларускага Інстытуту Гаспадаркі і Культуры, ёсьць думка супольнага зарганізаваньня ўрачыстага сьвяткаваньня юбілеяў ТБШ і Інстытуту.

═ У канцы гэтага году мінае 15 гадоў ад закладзінаў Беларускага Музэю ім. Ів. Луцкевіча ў Вільні. Як ведама, Музэй паўстаў са збораў с. п. Івана Луцкевіча, які ўжо ў 1918 годзе падараваў гэты бясцэнны нацыянальны скарб Беларускаму Навуковаму Таварыству, закладчыкам якога сам-жа быў. Нажаль, зарганізаваць з гэтых збораў публічны музэй ахвярадаўцы не давялося: 20 жніўня 1919 году Іван Луцкевіч памёр. Т-ва распачало арганізацыйную працу толькі ў канцы 1921 году, атрымаўшы дзеля гэтага бясплатнае памяшчэньне ў Базыліянскіх мурох (Вострабрамская 9), належаўшых тады йшчэ да праваслаўнага духавенства. З таго часу работа ў Музэі ўжо ня спынялася, а лічба рэчаў у ім усьцяж узрастала дый узрастае.

═ Архіў беларускага адраджэнскага руху. У Беларускім Музэі ёсьць багаты архіў— як старых актаў (ад XV стаг.), так і датычачых беларускага адраджэнскага руху. За мінулае лета праца над упарадкаваньнем архіву адраджэнскага руху значна пасунулася наперад, і цэлы рад асобаў ужо меў магчымасьць карыстаць з яго.

═ Беларускі Музэй ім. Ів. Луцкевіча ў Вільні атрымаў два невялікія сшыткі першых поэтыцкіх твораў Якуба Коласа з 1898 году. Творы гэтыя— вершы і проза—былі пісаны падчас вучэньня паэты ў расейскіх школах, дык Колас карыстаўся сьпярша расейскай мовай. Сшыткі няпоўныя, не хапае ў іх паасобных лісткоў. Паводле слоў ахвярадаўцы, Міхася Міцкевіча (брата паэты), гэткіх сшыткоў было больш, але яны недзе загінулі.

Гожа адзначыць, што ў музэйным архіве пераховываецца шмат рукапісаў беларускіх паэтаў і пісьменьнікаў: Коласа, Купалы, Максіма Багдановіча, Зьмітрака Бядулі, М. Гарэцкага, Ул. Жылкі і іншых.

═ Літаратурныя пятніцы. Дзеля ажыўленьня беларускага літаратурнага руху, наш часапіс арганізуе літаратурныя зборкі, г. зв. літаратурныя пятніцы. На „пятніцах“ учасьнічаюць беларускія паэты, пісьменьнікі і іншыя прадстаўнікі пяра, што цікавяцца літаратурнымі праблемамі і рухам. Першыя дзьве „пятніцы“, якія адбыліся ў канцы верасьня, прысьвечаны справам арганізацыі як самых „пятніц“, так і справе арганізацыі Саюзу беларускіх пісьменьнікаў і журналістаў; апрача таго, Максім Танк прачытаў чацьвёртую частку сваей паэмы „Нарач“ і іншыя творы. У парадку дзенным чарговых пятнічак — справа арганізацыі „Саюзу беларускіх пісьменьнікаў і журналістаў“ і чытаньне лібрэтта да беларускай опэры „Курган“, якую мае намер апрацаваць кампазытар Грэчанінаў. Лібрэтто напісаў мгр. Я. Хвораст.

═ Адміністрацыйныя ўлады ў Вільні ў другой палавіне ліпня сканфіскавалі зборнік вершаў маладога уталентаванага беларускага паэты і пісьменьніка Максіма Танка, нашага супрацоўніка. Зборнік мае назоў „На этапах“, зьмяшчаў на 9-х аркушах фармату васьмёркі больш сотні мастацкіх вершаў — прадукт творчай працы паэты апошніх гадоў.

═ Дня 6-га кастрычніка віленская радыёстанцыя надавала аўдыцыю „Лета на Віленшчыне“. Праграма аўдыцыі зьмяшчала рэфэрат, ілюстраваны солёвымі і харальнымі беларускімі народнымі песьнямі, выкананымі памастацку хорам грам Р. Шырмы. З прыкрасьцю зазначаем, што аўтар рэфэрату, гаворачы аб беларускіх традыцыйных звычаях і беларускіх народных песьнях, зусім тэндэнцыйна прамаўчаў, што яны беларускія, — гаварыў аб іх, як аб „нашых“, „тутэйшых“, сьпяваных там і там (павет), толькі не беларускіх. Радыёвы слухач так і не даведаўся, што мае тут дзела з харaством беларускай народнай традыцыі і песьні.

═ XII-ты Зьезд Саюзу Музэяў. У Варшаве ад 26 да 29 верасьня адбываў нарады што-годні зьезд дэлегатаў Саюзу Музэяў у Польшчы. З Вільні на зьезьдзе быў толькі прадстаўнік Беларускага Музэю ім. Івана Луцкевіча; польскія музэі з Вільні дэлегатаў сёлета не пасылалі.

У склад Саюзу ўваходзяць такжа украінскія музэі. На зьезьдзе былі тры украінскія дэлегаты із Львова і Коломыі.

* * *

═ Юбілей Якуба Коласа. Пад кіраўніцтвам камісара асьветы БССР Дзякава адбылося першае паседжаньне Камітэту ўшанаваньня трыццатай гадаўшчыны літаратурнай дзейнасьці народнага паэты Якуба Коласа. На паседжаньні вызначаны тэрмін юбілейных урачыстасьцяў. Сьвяткаваньне юбілею адбудзецца паміж 5 і 15 кастрычніка. Урачыстая акадэмія ў чэсьць Якуба Коласа адбудзецца 11-га кастрычніка, у памешканьні Першага Беларускага Дзяржаўнага Тэатру ў Менску.

═ Саюз Савецкіх Пісьменьнікаў БССР, у сувязі з юбілеем Якуба Коласа, вызначыў дэлегатаў, каторыя ў работніцкіх і чырвонаармейскіх клюбах прачытаюць рэфэраты аб жыцьці і творчасьці юбіляра. З рэфэратамі выступяць: паэт А. Александровіч, прафэсар Браншт эйн, акадэмік Замоцін, паэты: Гурскі, Глебка Пятрусь, Броўка Пятро і іншыя. — Апроч таго выдэлегаваны дзьве брыгады пісьменьнікаў дзеля зарганізаваньня юбілейных рэфэратаў у местах Беларусі — Гомелі, Бабруйску, Віцебску, Магілёве і інш.

14-га кастрычніка адбудзецца ў Доме Пісьменьніка БСРР у Менску прыняцьце Якуба Коласа. У прыняцьці возьмуць учасьце прадстаўнікі літаратуры іншых савецкіх рэспублік. Нумар 10 беларускага савецкага літаратурнага журналу „Полымя Рэвалюцыі“ будзе юбілейным нумарам.

═ Саюз Савецкіх Пісьменьнікаў БССР, пачынаючы ад кастрычніка месяца, арганізуе літаратурныя вечары. Вечары будуць адбывацца два разы ў месяц.

═ Інстытут асьпірантуры для маладых пісьменьнікаў Беларусі арганізуе Саюз Савецкіх Пісьменьнікаў БССР. Інстытут пачне працу ў 1936—37 акад. г. Заданьнем Інстытуту — паглыбленьне веды пісьменьнікаў у галіне марксістоўска-ленінскага літаратуразнаўства, гісторыі старасьвецкай заходнеэўрапэйскай і рускай літаратуры, а такжа знаёмасьць з іншымі галінамі мастацтва (гісторыя тэатру, малярства). У Інстытут асьпірантуры будуць прыймацца толькі тыя пісьменьнікі, што маюць вышэйшую асьвету.

═ Выйшла з друку кніжка п. з. „Беларуская Савецкая Паэзія" — рэфэрат паэты А. Александровіча, прачытаны на трэцім пленуме Саюзу Пісьменьнікаў СССР. Кніжка ілюстравана партрэтамі пісьменьнікаў БССР.

═ Над чым працуюць пісьменьнікі Сав. Беларусі? Міхась Зарэцкіпіша сцэнічны твор, абаснаваны на повесьці Аляксандра Сяргеевіча Пушкіна „Дуброўскі" (для другога дзяржаўнага беларускага тэатру), Самуйлёнак піша раман з жыцьця Грузіі „Будучыня", І. Гурскі піша сцэнічны твор „Кастрычнік на Беларусі", Васіль Каваль прыгатаваў да друку зборнік выбраных навэль і піша раман „Патомкі пасынкаў" з жыцьця калгаснай вёскі, Мікола Хведаровіч піша паэму аб паўстаньні ў Гомелі а такжа перакладае на беларускі язык паэму Пушкіна „Кавказскій пленьнік", Барыс Мікуліч піша раман „Скрыпка", Алесь Дудар, Пятрусь Глебка, Аркадзь Куляшоў — перакладаюць на беларускі язык паасобныя творы Пушкіна („Аўгені Анегін", „Барыс Гадуноў", „Цыганы").

═ Новая п'еса Якуба Коласа. Народны паэт Якуб Колас напісаў новую п'есу „Вайна вайне". П'еса напісана спэцыяльна для другога дзяржаўнага беларускага тэатру. П'еса будзе адыграна на сцэне ў сьнежні месяцы.

═ Усебеларускі (Сав. Беларусь) Дом Народнай Творчасьці. СНК БССР пастанавіў адкрыць у пачатку будучага году ў Менску Усебеларускі Дом Народнай Творчасьці. Дом Народнай Творчасьці будзе сыстэматычна арганізаваць дзеля паказу дасягненьняў мастацкай самадзейнасьці алімпіяды і выстаўкі. Кіраўніцтва дзеля спраў мастацтва цяпер займаецца падборам кваліфікаваных сілаў для Дому Народнай Творчасьці.

═ 15-га верасьня пачаў спэктаклі ў Менску Беларускі Дзяржаўны Тэатр Опэры і Балету. Тэатр будзе працаваць у Менску да 1-га студня. У рэпэртуары тэатру, у гэтым часе, — опэры: „Еўгені Анегін", „Рыгалето", „Пікавая дама", „Кармэн", „Сэвільскі цырульнік", балеты — „Капэлія", і „Канёк гарбунёк". Тэатр у гэтым сэзоне будзе так-жа працаваць над беларускай опэрай „На Купальле", музыку якой пішыць беларускі кампазытар Туранкоў.

═ Вясной 1937 году адбудзецца ў Парыжы міжнародная выстаўка „Мастацтва і Тэхнікі сяньняшняй пары". На выстаўку запрошана Савецкая Беларусь (БССР).

Выдавец: Беларускі Інстытут Гаспадаркі і Культуры.

Рэдакцыйная Калегія: др. Ст. Грынкевіч, Ад. Станкевіч, М. Пяцюкевіч, А. Бярозка і Я. Шутовіч.

Адказны Рэдактар: Ян Шутовіч.

Прысланыя кніжкі, часапісы і інш'

Rajmund Gostkowski, Kapłani i Kapłanki w sztuce kreteńsko-mykeńskiej i greckiej. Вільня 1936.

Balticoslavica, т. II. Вільня 1936.

Rola Słowaczyzny w militarnym sojuszu Czechów z bolszewicką Rosją, Варшава 1936.

Жінка, ч. 13—14. Львоў 1936.

Назустріч, ч. 13, 14, 15, 16, 17, 18, 19. Львоў 1936.

Богословія, кн. 2—3. Львоў 1936.

Вістнік, кн. 9, 10. Львоў 1936.

Дзвони, ч. 3, 6—7, 8—9. Львоў 1936.

Рідна Мова, ч. 8, 9, 10. Варшава 1936.

Нова Хата, ч. 18. Львоў 1936.

Обрії, ч. 21—22, 23—24. Львоў 1936.

Katolik, Č. 11. Прага 1936.

Život, č. 14—15, 16—17, 18. Прага 1936.

Pax, № 9. Вільня 1936.

Oriens, № 4, 5. Варшава 1936.

Ад Рэдакцыі:

Рэдакцыя просіць ПТ сваіх сўпрацоўнікаў найхутчэй прысылаць літаратурны і навуковы матарыял да друку ў наступныя кніжкі „Калосься“.

